75 мірных гадоў Беларусь ПАМЯТАЕ!

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 МАЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 88 (29202)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

# Наша Вялікая Перамога — бясцэнная спадчына

*Дарагія суайчыннікі!*

*Віншую вас з 75-годдзем Вялікай Перамогі.*

*Беларусь адзначае гэтую знамянальную дату ў няпросты час. Аднак нашы сённяшнія складанасці цьмянеюць перад нягодамі, цяжкасцямі і стратамі, што выпалі на долю гераічнага пакалення, якое выратавала свет ад карычневай чумы.*

*Мы бясконца ўдзячныя ветэранам, якія ў гэты святы для ўсяго народа дзень разам з намі. Аддаём даніну павагі патрыятызму, стойкасці і працавітасці працаўнікоў тылу.*

*Схіляем галовы ў памяць аб тых, хто не ўбачыў пераможныя майскія салюты 1945 года, перад горам маці, якія не дачакаліся сваіх сыноў і дачок. Смуткуем і памятаем аб усіх ахвярах той страшнай вайны.*

*Аднак жыццё заўсёды перамагае смерць. Таму беларусы павінны захаваць назаўсёды гэтую бясцэнную спадчыну — нашу Вялікую Перамогу. Свята шанаваць і абараняць яе ад паклёпу і фальсіфікацый.*

*Ад усёй душы жадаю вам, дарагія суайчыннікі, мірнага неба, здароўя, шчасця, дабрабыту і новых здзяйсненняў на карысць роднай Беларусі.*

**Прэзідэнт**
**Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота БелТА.

# ЮБІЛЕЙНЫ МАЙ КУЛЯМЁТЧЫКА ЛЯХОЦКАГА

ISSN 1990 - 763X

Напярэдадні юбілею Перамогі, 7 мая, ён адзначыў свой юбілей. Ды яшчэ які! 100 гадоў споўнілася ветэрану з Пружан Мікалаю Іванавічу ЛЯХОЦКАМУ. З гэтай датай яго павіншавала нямала людзей. Самыя цёплыя словы падзякі ад усіх жыхароў раёна адрасаваў франтавіку старшыня райвыканкама Юрый Бісун.

Былі кветкі, падарункі, успаміны. Мікалая Ляхоцкага прызвалі адразу пасля вызвалення Пружан. Пасля кароткай вучобы на фронт накіраваўся кулямётчыкам, у баі за вызваленне Польшчы атрымаў цяжкае раненне. Перамогу сустрэў у шпіталі. Пасля вайны вярнуўся ў родны горад, дзе і пражыў усё жыццё. Шмат гадоў працаваў кіроўцам на машыне хуткай дапамогі. Для журналістаў і краязнаўцаў Мікалай Іванавіч заўсёды быў знаходкай. Бо добра ведае і даваенны, і пасляваенны горад, шмат можа расказаць пра яго жыхароў і гістарычныя падзеі. А вось сам аднойчы трапіў у гісторыю не зусім звычайным чынам. У 1980-я, калі рыхтаваліся кнігі «Памяць», у раёнцы змясцілі спіс землякоў, якія загінулі пры вызваленні Польшчы. Там Мікалай Ляхоцкі сустрэў... і сваё прозвішча. Потым памылку выправілі, папрасілі прабачэння, сказалі, што ветэран пражыве доўга. Так і сталася.

Са сваёй другой палавінкай Лідзіяй Паўлаўнай яны пражылі ў згодзе 70 гадоў. І цяпер Мікалай Іванавіч вельмі сумуе без яе. Але адзінокім у гэтыя святочныя вясновыя дні ён сябе не адчувае — радуюць увагай многія людзі, блізкія і далёкія.

Дапамога

# У ЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЯХ ГУМАНІТАРНАГА РУХУ

## На ветэранаў і іх сем'і, пажылых людзей і медыкаў накіравана сёння ўвага Беларускага Чырвонага Крыжа

**У картатэцы Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа знаходзіцца больш за 20 тысяч вышуковых спраў, больш за 17 тысяч з іх звязаны з падзеямі Вялікай Айчыннай. Далёка не ўсе яны завершаны, і пошукі працягваюцца пастаянна. Размова не толькі пра тых, хто прапаў без вестак, хоць большасць спраў — менавіта пра гэта.**



Сёння адзначаецца Міжнародны дзень Чырвонага крыжа і Чырвонага Паўмесяца. І цяпер гэта арганізацыя запатрабавана як ніколі.

### ВЫШУК НЕ СПЫНЯЕЦЦА

— Пры разборы рэчаў, якія прыносяць у нашы кантэйнеры, на адным з пінжакоў мы знайшлі ордэн славы ІІ ступені. Зрабілі запыты ў расійскія архівы. Знайшлі нашчадкаў. На жаль, самога гаспадара гэтага ордэна даўно няма ў жывых, таму вярнулі ўзнагароду яго спадчынніку, — расказвае **генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Вольга МЫЧКО.**

Гісторый аб пошуку герояў Вялікай Айчыннай і іх нашчадкаў вельмі шмат, і Чырвоны Крыж дапамагае сем'ям знайсці звесткі, магілы і памятныя рэчы іх блізкіх.

— Нядаўна да нас паступіў запыт з нямецкага Чырвонага Крыжа. Даслалі фотаздымкі заручальных пярсцёнкаў. Іх гаспадары загінулі ў канцэнтрацыйным лагеры. А на ўнутраным баку пярсцёнкаў захаваліся надпісы. Па іх вызначылі, што гаспадары былі з Беларусі. Мы высветлілі, што блізкія гэтых людзей пераехалі ў Ізраіль, і цяпер справай займаюцца тамтэйшыя арганізацыі, — кажа Вольга Мычко.

Дагэтуль блізкія з дапамогай Чырвонага Крыжа знаходзяць магілы сваіх родных, што загінулі ў вайну, на тэрыторы Польшчы, Германіі і іншых краін. І, атрымаўшы заключэнне Чырвонага Крыжа, нашчадкі могуць бясплатна выехаць у гэтыя краіны і ўшанаваць памяць блізкіх. Многія карыстаюцца такой магчымасцю штогод. Сёння работа службы вышуку арганізацыі звязана і з найноўшай гісторыяй — тут дапамагаюць сем'ям знайсці звесткі аб родных, страчаных у выніку не такіх даўніх лакальных канфліктаў. Паступаюць запыты з Лівіі, Казахстана,Туркменістана, Сірыі.

### ГАЛОЎНЫ КЛОПАТ

Адзін з галоўных клопатаў Чырвонага Крыжа сёння — рэагаванне на сітуацыю, звязаную з распаўсюджваннем каранавіруса. Для гэтых мэт задзейнічана каля 1,5 тысячы валанцёраў. Яны займаюцца дастаўкай адзінокім пажылым людзям і інвалідам прадуктаў і прадметаў першай неабходнасці, рэцэптаў, набыццём лекаў, аплатай камунальных паслуг і мабільных тэлефонаў.

— Мы ўпершыню сутыкнуліся з такой маштабнай надзвычайнай сітуацыяй. Спачатку наша дапамога найбольш была запатрабавана ў Віцебску і Мінску, зараз мы накіроўваем свае сілы ў Брэсцкі і Гомельскі рэгіёны, — тлумачыць Вольга Мычко. — Наша задача — каб усе, хто знаходзіцца ў самаізаляцыі, маглі быць там як мага даўжэй.

— Штодзень у нас працуе каля 90 валанцёраў, — працягвае **нацыянальны каардынатар валанцёраў COVID-19 Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Алена РУСІНОВІЧ.** — У Мінску ў іх большая запатрабаванасць, у сельскай мясцовасці, дзе пажылы чалавек можа выбраць час і прыйсці ў краму, дзе ён будзе адзін, — меншая. За гэты час — з канца сакавіка — нашы валанцёры зрабілі больш за тры тысячы даставак прадуктаў і столькі ж даставак рэцэптаў і лекаў пажылым, якія раней не мелі патрэбы ў дапамозе сацыяльных работнікаў.

Акрамя таго, медыцынскія сёстры і малодшыя сёстры міласэрнасці Чырвонага Крыжа працягваюць аказваць дапамогу дома цяжка хворым і інвалідам у межах сваёй праграмы «Дапамога». Сёстры міласэрнасці старэйшага ўзросту па рашэнні арганізацыі таксама абмежавалі ў гэты час свае кантакты. Цяпер яны аказваюць дапамогу па тэлефоне. Чырвоны Крыж адкрыў тэлефонную лінію «Добры тэлефон» (нумар 201 для мабільных тэлефонаў і 122 — для стацыянарных). Тут можна атрымаць актуальную інфармацыю пра каранавірусную інфекцыю і меры бяспекі, а таксама псіхалагічную падтрымку.

На барацьбу з распаўсюджваннем COVID-19 беларускі Чырвоны Крыж сабраў 1,7 мільёна рублёў. За гэтыя грошы закупляюцца сродкі індывідуальнай ахове для беларускіх медыкаў. Яны перададзены Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 1, Лунінецкай цэнтральнай раённай бальніцы, Гродзенскай абласной і Мінскай гарадской станцыям хуткай медыцынскай дапамогі, 23-й і 27-й гарадскім паліклінікам Мінска.

Дзякуючы спонсарскай дапамозе Мінскага завода безалкагольных напояў і кампаніі «Лідскае піва» для пацыентаў і персаналу бальніц Мінска была дастаўлена бутыляваная вада. Працягваецца і акцыя «Медабед» — разам з рознымі кампаніямі Чырвоны Крыж дастаўляе бясплатныя гарачыя абеды медперсаналу бальніц.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Парламент Ірака ўхваліў праграму новага ўрада



Савет прадстаўнікоў (парламент) Ірака выказаў давер ураду новага прэм'ер-міністра краіны Мустафы аль-Казімі і ўхваліў яго праграму. Пра гэта паведаміў тэлеканал Sky News Arabia. Паводле інфармацыі тэлеканала, у ходзе вячэрняга пасяджэння Мустафа аль-Казімі, які раней узначальваў іракскую разведку, прынёс парламенту прысягу ў якасці кіраўніка ўрада. З моманту звяржэння Садама Хусейна ў 2003 годзе ён стаў шостым прэм'ер-міністрам Ірака. Пры фарміраванні кабінета міністраў аль-Казімі зыходзіў з прадстаўніцтва палітычных блокаў у парламенце. Так, шыіцкім сілам было аддадзена 11 міністэрстваў, сунітам — шэсць, а курдам дасталіся тры партфелі. Усяго ў новым урадзе будзе 22 міністры.

### У Індыі адбылася трагедыя на хімічным заводзе



По меншай меры восем чалавек сталі ахвярамі ўцечкі атрутнага газу на ўсходзе Індыі. Каля тысячы атрымалі атручванні рознай ступені цяжкасці. Каля 70 чалавек, па звестках мясцовых СМІ, знаходзяцца ў бальніцах у цяжкім стане. Трагедыя адбылася на хімічным заводзе паўднёвакарэйскай кампаніі LG. Прадпрыемства было спынена пасля ўвядзення каранціну 25 сакавіка. Дзве ёмістасці са стыролам, што прымяняюцца для вытворчасці палімераў, па пяць тысяч тон кожная, засталіся без нагляду. Кіраўніцтва зараз высвятляе, якім чынам магла адбыцца ўцечка. Расследаванне ўзяў пад кантроль прэм'ер-міністр Індыі, перадае Euronews. Жыхарам раёнаў, якія размешчаны побач з заводам, раяць закрываць рот і нос вільготнай тканінай.

### Французскія півавары выльюць 10 мільёнаў літраў піва



Маштабныя абмежаванні, уведзеныя на фоне пандэміі каранавіруса, сур'ёзна адбіліся на піваварах Францыі. Яны вымушаны ўтылізаваць не менш за 10 млн літраў пеннага напою з-за рэзкага падзення попыту. Такія звесткі дае прафсаюз Brasseurs de France («Піавары Францыі») па выніках нарады з удзелам прадстаўнікоў 300 прадпрыемстваў, якія займаюць 98 % французскага рынку. «Раптоўнае закрыццё кафэ, рэстаранаў, спыненне турыстычнай дзейнасці і адмена ўсіх фестываляў і кірмашоў прывялі да пратэрміноўкі піва, якое знаходзілася ў асноўным у бочках, — цытуе газета Les Echos заяву арганізацыі. — Утылізацыя гэтага піва таксама прывядзе да прыкметных укладанняў з боку прадпрыемстваў». Агульныя страты ацэньваюцца ў некалькі мільёнаў еўра, што для некаторых кампаній можа аказацца вельмі адчувальным.

На думку парламентарыя

# ЗАМАСКІРАВАНАЯ РЭЧАІСНАСЦЬ

## Няважна, чым вы прыкрываеце рот, важна — як

Марля, бавоўна, будаўнічыя рэспіратары і бялізнавы трыкатаж, чорныя, белыя і з дызайнерскімі малюнкамі — з маскамі, якімі мы зараз спрабуем абараніцца ад каранавіруса, хутка можна будзе ладзіць тыдні моды. Але ў пагоні за арыгінальнасцю і трэндам мы забываемся пра галоўнае: мала проста «прыбраць» твар — трэба зрабіць гэта правільна.

Наяўнасць нават рэспіратара з узроўнем абароны FFP3 не гарантуе правільных паводзін. Зусім нядаўна бачыў, як упэўнены ў сабе 40-гадовы мужчына рашуча дыхаў у зменны фільтр і адначасова цёр рукамі ў пальчатках вочы. Ну і які атрымліваецца сэнс у яго цуда-маскі?

Я як дэпутат у сацыяльных сетках перыядычна звяртаюся да людзей, каб нагадаць: усё трэба рабіць з розумам. Маскі мы носім, каб абараніць навакольных ад сябе. Рэспіратары 2-га і 3-га класаў абароны павінны ў першую чаргу насіць урачы, што кантактуюць з хворымі. Біяфізік і прафесар Чыкагскага ўніверсітэта Маргарэт Гардэль, дарэчы, таксама нядаўна заклікала аддаваць у побыце перавагу варыянтам з тканіны — гэта дапаможа і знізіць перадачу віруса, і не павялічыць дэфіцыт аднаразовых ахоўных сродкаў, неабходных медыкам.

Любая прамоклая маска павінна неадкладна здымацца, аднаразовая — насіцца адзін раз. Прычым, калі ў рэспіратарных масак няма здымных клапанаў, то іх таксама смела можна лічыць аднаразовымі і здымаць пры дзве гадзіны. Адцягваем маску за «вушкі», прычым, пажадана, рукі прадэзынфікаваць. Твар не чапаем і ў вочы не лезем. Пашылі сабе модны аксесуар з цікавым прынтам? Проста зрабіць сэлфі недастаткова. Маску трэба насіць і не забываць яе мыць. Прычым вымочваць у спірце або грэць у мікрахвалеўцы не трэба — дастаткова закінуць у машынку ці прапаласкаць у гарачай мыльнай вадзе.

Вы спытаеце, навошта гаварыць тысячны раз аб відавочных рэчах? А затым, што памятаем мы пра іх роўна пяць хвілін. А потым зноў Наталля Пятроўна ўпэўнена кашляе ў далоньку і ёю ж адкрывае дзверы ў краму, яе сусед сцягвае маску на падбародак, таму што «дыхаць перашкаджае, а насіць неяк трэба — вірусы ж гуляюць», а над прылаўкам да вас упэўнена прыціскаецца баба Аня, у якой няма 30 секунд, каб дачакацца заканчэння вашага разліку, ёй трэба глянуць на супавы набор зараз жа. Калі яе шчыльна прылеглая да твару маска коўзаецца па вашым плячы, прайграюць усе. Ёсць хвілінка — скапіруйце тэкст у сваю сацыяльную сетку або перакажыце суседзы, каб на наступныя пяць хвілін яшчэ некалькі чалавек успомніла пра бяспеку.

Нядаўна я як член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы выказваў СМІ сваё меркаванне: уводзіць жорсткі каранцін няма неабходнасці, але нельга забывацца аб асабістай адказнасці кожнага з нас. Неабходна выконваць меры асабістай гігіены, пазбягаць месцаў збору людзей, абмяжоўваць перамяшчэнні і кантакты, аказваць разнастайную дапамогу бацькам, пажылым сваякам, растлумачваць і пераконваць, што яны павінны заставацца дома ў гэты складаны час. І не насіць сваю арыгінальную маску па трое сутак, бо, акрамя эстэтыкі, ніякай карысці з яе не будзе.

**Ігар ЗАВАЛЕЙ,**
**дэпутат Палаты прадстаўнікоў.**

Да ведама

## Пенсіі — датэрмінова

«Белпошта» выплаціць пенсіі і дапамогі за 9 мая датэрмінова, паведамілі на прадпрыемстве.

Выплата пенсій за 9 мая ў аддзяленнях паштовай сувязі Мінска, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей пачалася з 6 мая. У Віцебску, Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях — з 7 мая, у Брэсце — з 8 мая. 9 мая будуць працаваць толькі дзяжурныя аддзяленні пошты.

Пра рэжым работы аддзяленняў можна даведацца ў кантакт-цэнтры «Белпошты» па нумары 154. З панядзелка да пятніцы кантакт-цэнтр працуе з 9.00 да 20.00, у суботу і нядзелю — з 9.00 да 17.00. Званкі 9 мая прымаюцца таксама з 9.00 да 17.00.



# ПАНТЭОН ПАМЯЦІ

**Сёння ў Мінскім храме Усіх Святых пройдзе ўрачыстасць закладвання капсул з зямлёю з брацкіх магіл воінаў-вызваліцеляў, пахаванняў мірных жыхароў забітых, спаленых і закатаваных у часы вайны, якія працаліся па нашай тэрыторыі.**



ЗЯМЛЮ з прахам — як вынік акцыі «У гонар агульнай Перамогі» даставілі з усіх раёнаў краіны, а таксама з блізкага і далёкага замежжа, з гарадоў-герояў. Асноўныя дзеянні ўрачыста-жалобнай працэсіі пройдуць у крыпце-усыпальніцы, у якую тры дні таму і былі дастаўлены ўсе урны ў выглядзе невялікіх шкляных сасудаў. Напярэдадні падзеі мне выдалася магчымасць пабываць у гэтым асаблівым месцы смутку, спачыну і памяці, паглядзець, як ідзе падрыхтоўка да ўрачыстасці, зрабіць некалькі здымкаў. А таксама ўбачыць унікальную тэматычную экспазіцыю «Музея Памяці». Невялікае па памеры музейнае памяшканне, адмыслова спраектаванае падчас будоўлі храма, знаходзіцца побач з крыптай. Аснову матэрыялаў экспазіцыі чатырох залаў складаюць аўтэнтычныя прадметы і асабістыя рэчы, знойдзеныя з астанкамі невядомых салдат трох войнаў, якія спачываюць у храмавым пантэоне памяці.



Мяне ўразілі літаральна ўсе артэфакты, кранула арыгінальнае рашэнне тэмы спадчыны войнаў, дыярамы-мініяцюры «Яны змагаліся за Беларусь», якія створаны па гістарычных батальных сюжэтах.

Не пакідае абыякавым памяць пра воінаў-інтэрнацыяналістаў, ліквідатараў аварыі на ЧАЭС, пра святароў, якія ўдзельнічалі ў народным супраціўленні, ваявалі на франтах. Уражвае фатаграфічная галерэя ў выглядзе крыжа пра святароў Мінскай епархіі, якіх рэпрэсіравалі ў 1930-х. Да болю кранула тэма, якая доўгі час была як быццам пад забаронай: «Загінулыя ў лагеры смерці ў вёсцы Малы Трасцянец». На музейным стэндзе прадстаўлены ўнікальныя прадметы вязняў лагера з урочышча Благаўшчына пад Мінскам, знойдзеныя падчас правядзення сельгасработ у 2000-я гады, і мініяцюрны макет адной з фабрык смерці...

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## Вясновае

# СТАЛІЧНЫЯ КВЕТКІ

**З вясной прыходзіць не толькі цяпло, але і час традыцыйнага добраўпарадкавання вуліц, жылых двароў, сквераў і паркаў. Мы ж даведаліся, што сёлета плануюць зрабіць у сталіцы.**

Летнія кветкі на вуліцах Мінска пачалі з'яўляцца зусім нядаўна (нізкая тэмпература ноччу не дазваляла пасадзіць іх раней).

— Кожны год нашы супрацоўнікі высаджваюць больш за два мільёны летніх кветак. Сёлета мы працягнем павялічваць колькасць мнагалетнікаў у афармленні клумбаў, — кажа кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і захаванні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі УП «Мінскзеленбуд» Анжаліка ПУЗАНКОВА. — У гэтыя кампазіцыі дададзім хваёвыя кусты. Новыя ўпрыгожванні з'явяцца і ў Сендайскім скверы ў выглядзе мнагалетнікаў — яны парадуюць нават зімой. А да 75-годдзя Перамогі ў кожным раёне горада з'явяцца тэматычныя кветнікі.

**У Мінску плануюць стварыць інтэрактыўную карту зялёных насаджэнняў — на ёй можна будзе знайсці інфармацыю пра кожнае дрэва і яго стан.**

Напрыклад, у Маскоўскім раёне яны знаходзяцца каля мемарыяла «Памяць» на праспекце Дзяржынскага і каля раённай адміністрацыі, а ў Цэнтральным — на скрыжаванні праспектаў Пераможцаў і Машэрава, на праспекце Пераможцаў каля «Атланта» і на праспекце Незалежнасці каля Палаца прафсаюзаў. Наогул, да Дня Перамогі спецыялісты «Мінскзеленбуда» пачалі рыхтавацца яшчэ восенню: у горадзе было высаджана 300 тысяч цыбульных кветак, якія ўжо зараз упрыгожваюць сталічныя вуліцы, паркі і скверы.



Што ж датычыцца мнагалетнікаў, то яны будуць складаць амаль палову мінскіх кветнікаў. На праспекце Незалежнасці каля Белдзяржцырка з'явіцца абсалютна новая кампазіцыя з ружовых ружаў, шалфею і кустоў лімоннага колеру. Спецыялісты адзначае, што ў азеляненні Мінска таксама будуць працягваць выкарыстоўваць і збожжавыя культуры — міскантус кітайскі, маліній і аўсяніцы. Іх будуць аб'ядноўваць у кампазіцыі з эхінацэяй і пажарніцай.

Што ж датычыцца жылых двароў, то ў 2020 годзе ў Мінску на іх тэрыторыі з'явіцца 6 тысяч 810 новых дрэў і 25 тысяч 960 кустоў. Дарэчы, за вясновы месячнік ужо было высаджана 6551 дрэва і 16 603 кусты. Акрамя гэтага, у горадзе адрамантуюць 28 тысяч адзінак новага абсталявання для дзіцячых пляцовак і малых архітэктурных форм (гэта могуць быць лаўкі, урны).

— Мы плануем зрабіць бягучы рамонт 580 прыдамавых тэрыторый і 12 пляцовак для выгулу сабак, плануем капітальна адрамантаваць 12 жылых двароў, — тлумачыць намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду і рабоце з насельніцтвам Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Анастасія ВАРАБ'ЁВА. — Як правіла, падчас капітальнага рамонту прыводзяць у парадак пешаходныя сувязі, мяняюць абсталяванне дзіцячых пляцовак, малыя архітэктурныя формы і ствараюць для грамадзян бездар'ернае асяроддзе.

**Валерыя КІСЛАЯ. Фота дадзена УП «Мінскзеленбуд».**

## Надвор'е

# На Дзень Перамогі будзе сонечна

### Але ў ноч на суботу магчымыя замаразкі да двух градусаў з мінусам

**У канцы працоўнага тыдня надвор'е ў краіне палепшыцца. З ростам атмасфернага ціску ападкі спыняцца, але чакаецца паступленне паветраных мас з паўночнага захаду Еўропы, таму ў начныя гадзіны высокая верагоднасць замаразкаў. А ў выхадныя нас чакае досыць камфортнае надвор'е — аж да 24 градусаў цяпла і без істотных ападкаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

На любімае свята 9 Мая захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, без ападкаў. Уначы чакаецца даволі істотнае пахаладанне ад плюс 1 градуса да плюс 7 градусаў, а па ўсходзе краіны ў асобных раёнах магчымы замаразкі да мінус 2 градусаў. Тэмпература ўдзень павысіцца да 15—21 цяпла, у Мінску ў разгар дня чакаецца ад плюс 16 градусаў да плюс 18 градусаў.

У нядзелю цёплы май возьме ўладу над надвор'ем. У гэты дзень адаб'ецца ўплыў цёплай паветранай масы, якая рухаецца да нас з тэрыторыі Заходняй Еўропы. Будзе без істотных ападкаў. Тэмпература паветра яшчэ крыху павялічыцца: уначы будзе 2—8 цяпла, а ўдзень — ад плюс 17 градусаў да плюс 24 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня чакаецца змяненне надвор'я. Актыўная сістэма франтальных падзелаў перамесціцца з Балтыйскага мора, і ўслед за ёй да нас прыйдуць больш халодныя паветраныя масы. Ужо ў гэты панядзелак уначы пераважна па паўночным захадзе, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны месцамі магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 градусаў да плюс 13 градусаў. Удзень будзе 10—17 цяпла, аднак па паўднёвым усходзе краіны значна цяплей — да плюс 18—25 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



# БАЧЫЦЬ, ВЕДАЦЬ, НЕ ЗАБЫВАЦЬ

**Можна па-рознаму захоўваць памяць пра Другую сусветную: добраўпарадкаваць помнікі і ўскладаць кветкі, віншаваць ветэранаў і завязваць чырвоныя стужкі, ствараць фільмы, песні, кнігі пра вайну, праводзіць урокі мужнасці ў навучальных установах і паходы ды велапрабегі па мясцінах баявой славы. А можна пашыраць веды пра тыя падзеі, і чым далей мы ад 1945 года, тым больш прырастае інфармацыі. Над ваеннай тэмай працуюць розныя інстытуты і ўстановы, інтэрнэт дазваляе распаўсюджваць каштоўную інфармацыю, дае большыя магчымасці для пошуку адказаў на разнастайныя пытанні і вывучэння гісторыі.**

## ВІРТУАЛЬНЫЯ ПАДАРОЖЖЫ

Да 75-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне Нацыянальная бібліятэка Беларусі стварыла новы інтэрнэт-праект — сайт «Падпольны і партызанскі рух Беларусі» (https://heritage.nlb.by/s/victory/page/home).

Тут выкладзена каля 150 улётак і рукапісных матэрыялаў, больш за тысячу выпускаў газет (каля ста найменняў), што ствараліся ў ваенныя гады. Усе гэтыя дакументы дазваляюць прасачыць за падзеямі, што адбываліся на акупаванай тэрыторыі БССР: падчас вайны тут дзейнічалі падпольныя абкамы, гаркамы, райкамы і пярвічныя арганізацыі КП(б)Б, якія кіравалі партызанскімі атрадамі, а таксама камсамольскія і антыфашысцкія арганізацыі. Дзякуючы сур'ёзнай зладжанай рабоце ім удалося стварыць 10 абласных і 50 раённых друкарняў. Друкарская справа спрыяла пашырэнню партызанскага руху. Газеты і ўлёткі распавядалі пра падзеі на фронце, подзвігі партызанаў і злачынствы, што чыніліся акупантамі.

У праекце пададзены электронныя копіі партызанскіх і падпольных выданняў. Газеты, улёткі, плакаты, часопісы, рукапісы адсканаваны з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Дзякуючы сучасным тэхналогіям сёння можна здзейсніць падарожжа па гарадах-героях Вялікай Айчыннай вайны, нават не выходзячы з дому. Праект «Шлях да Перамогі» знаёміць з дакументальнымі фатаграфіямі. Распрацаваны аўтарскія аўдыягіды, якія раскажуць пра барацьбу за Мінск, Маскву, Ленінград, Брэст, Кіеў, Сталінград, Адэсу, Севастопаль і іншыя гарады Савецкага Саюза.

## РЭЧЫ — СІМВАЛЫ

Музей працягвае працаваць і ў звычайным рэжыме. 9 мая наведвальнікі змогуць забрацца ў салон самалёта Лі-2, які знаходзіцца на прылеглай да музея тэрыторыі, і сфатаграфавацца ля копіі Сцяга Перамогі. Да таго ж будзе працаваць перасоўная экспазіцыя музея «Перамога 75: дарогамі мужнасці і славы». Для сем'яў і невялікіх груп супрацоўнікі музея распрацавалі інтэрактыўную праграму з элементамі квэсту «Шлях да Перамогі», дзе ўдзельнікі будуць пераадольваць перашкоды, выконваць «баявыя заданні» ў музейных залах і пры гэтым пашыраць свае веды па гісторыі.

У Мінскай гарадской ратушы працуе выстаўка «Сімвалы Перамогі». Праект падрыхтаваны Музеем гісторыі горада Мінска сумесна з Беларускім саюзам дызайнераў і Беларускім рэспубліканскім аб'яднаннем калекцыянераў. Тут можна пабачыць жывапіс, графіку, вырабы дэкаратыўна-прыкладнога і медальернага мастацтва, а таксама кнігі, дакументы, паштоўкі і прыватныя рэчы ветэранаў вайны.

Пасля прысваення ў 1974 годзе Мінску статусу горада-героя з'явілялася багата рэчаў з сімволікай Перамогі, выявамі стэлы «Мінск — горад-герой» і манументам Перамогі. Гэта былі статуэткі, медалі, значкі, сувеніры. Адпаведны дэкор падчас святкавання юбілейных дат наносіўся на чайныя сервізы, вазы. Перамозе прысвячаліся карціны і плакаты. На выставе прадстаўлены работы Уладзіміра Крукоўскага, Уладзіміра Цэслера, Сяргея Войчанкі з калекцыі Беларускага саюза дызайнераў.

**Падрыхтавала
Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**




## Пасыл у будучыню

# ЖАНЧЫНЫ ЗДАБЫВАЛІ ПЕРАМОГУ

**Перасоўная фотавыстаўка «Жаночы твар Перамогі» адкрылася ў Палацы прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Экспазіцыю падрыхтаваў Беларускі саюз жанчын сумесна з Музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**

Выстаўка прысвечана 75-годдзю Вялікай Перамогі. **Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ, намеснік старшыні БСЖ Лілія АНАНІЧ** адзначыла, што прадстаўленыя фота наглядна ілюструюць усенародны характар барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.




«Жанчыны на вайне — гэта не проста тыл, — сказала Лілія Ананіч. — Жанчыны на роўных з мужчынамі набліжалі перамогу, яны былі медсёстрамі, падрыўнікамі, сувязістамі... Толькі ў партызанскіх атрадах і ў падполлі Беларусі ваявала больш за 70 тысяч жанчын. Жыццё партызан ратавалі 570 жанчын-дактароў і больш за дзве тысячы медсясцёр. Звання Героя Савецкага Саюза ўдастоены дзевяць жанчын — удзельніц партызанскага руху і падполля Беларусі, чатыры з іх — пасмяротна.

Сёння наша краіна рыхтуецца да парада — гэта сімвал велічы і мужнасці старэйшага пакалення, якое вынесла на сваіх плячах цяжкую вайну. Мы павінны быць годнымі нашчадкамі гэтых людзей. Наш парад — гэта наш пасыл у будучыню».

Акцыя «Беларусь памятае. Жаночы твар Перамогі» была задумана яшчэ ў 2019 годзе БСЖ і мела на мэце паказаць унёсак жанчын у Вялікую Перамогу. Да гэтага арганізацыя разам з Музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны правяла шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку тэматычную канферэнцыю.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ, фота аўтара.**

## Наш фармат

# «Бывайце здаровенькія!»

**У Мінску, у падземным пераходзе станцыі метро «Кастрычніцкая», на месцы, дзе звычайна былі тэатральныя афішы, з'явіліся жыццесцвярджальныя цытаты са знакамітай «Паўлінкі». Такім чынам падтрымаў сваіх любімых гледачоў і наогул усіх беларусаў Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы.**




Фота дадзена тэатрам.

— Традыцыйныя афішы, якія звычайна размяшчаюцца ў пераходзе да Дома Афіцэраў, мы часова, пакуль тэатр не працуе ў звычайным рэжыме, замянілі на гэтыя плакаты. Рэалізацыяй ідэі займаўся аддзел праектаў і развіцця тэатра сумесна з дызайнерам Анастасіяй Камінскай, — расказала «Звяздзе» **намеснік генеральнага дырэктара Купалаўскага тэатра Святлана ШЫЦІКАВА.** — Да цытат, выбраных з легендарнай «Паўлінкі», дададзены пажаданні ад купалаўцаў усім беларусам — гэта наша падтрымка для кожнага, наш пасыл з добрымі пажаданнямі быць усім разам і дапамагаць адно аднаму ў цяперашні няпросты перыяд.

«Тудэма-сюдэма... І мы вернемся!», «Бывайце здаровенькія!», «Дзве дзюркі ў носе і скончылося!», «А мае ж вы родненькія, падтрымаем адзін аднаго», «Бо калі ўсё пайшло ўверх нагамі, хутка стане на свае месцы!» Гэтыя і іншыя фразы з вядомай п'есы Янкі Купалы з дапаўненнямі (яны вылучаны буйным шрыфтам) ад акцёраў красуюць у пераходзе замест афіш Купалаўскага тэатра, які часова закрыты для публікі. Як паведамляе афіцыйны сайт установы, усе спектаклі адменены да 17 мая ўключна. Таксама адменены і некаторыя пазнейшыя пастаноўкі — «Рэвізор» 20 мая, «Пінская шляхта» 21 мая, «En souvenir de Шагал» 28—30 мая і 1—15 чэрвеня. (Але пры жаданні білеты на паказы можна не здаваць у касу тэатра, а захаваць і наведаць названыя спектаклі да канца бягучага года.) Каб не губляць сувязі з аўдыторыяй, тэатр працягвае трансліраваць на інтэрнэт-пляцоўках спектаклі з бягучага рэпертуару і архіўныя запісы — у праектах «Купалаўскі online» і «Купалаўскі дома», запрашае ў віртуальную чытальную залу «Чытаць я хацеў», дзе акцёры чытаюць анлайн творы беларускіх і замежных аўтараў, а таксама рэалізуе дабрачынную ініцыятыву «Нетэатральная маска» па вырабе ахоўных масак на патрэбы сталічных бальніц.

Нагадаем, спектакль «Паўлінка» — своеасаблівая візітоўка Купалаўскага тэатра; менавіта ёй ужо каля 80 гадоў распачынаецца кожны сезон, у тым ліку бягучы, юбілейны 100-ты. Напрыканцы мінулага года пастаноўка была ўключана ў спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў нашай краіны.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## Класныя навіны

# Адзінаццацікласнікаў не пазбавяць шанцаў!

**Заключны тур рэспубліканскай алімпіяды па 18 вучэбных прадметах пройдзе з 11 па 14 мая толькі для навучэнцаў выпускных класаў. Пра гэта паведаміла Міністэрства адукацыі ў сваім афіцыйным Telegram-канале.**

Звычайна заключны тур для ўсіх школьнікаў праходзіў падчас вясенніх канікул, але сёлета тэрміны яго правядзення былі пасунуты ў сувязі з трывожнай эпідэміялагічнай абстаноўкай. Сітуацыя з распаўсюджваннем каранавіруса па-ранейшаму застаецца напружаная, таму рашэнне праводзіць заключны тур толькі сярод адзінаццацікласнікаў звязана з мэтай мінімізаваць рызыку для здароўя школьнікаў. Разам з тым пераможцы заключнага тура алімпіяды з ліку навучэнцаў выпускных класаў маюць ільготы пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, таму адзінаццацікласнікам будзе дадзена магчымасць паспаборнічаць і заваяваць дыпломы пераможцаў, якія гарантуюць адпаведную льготу. Ім, канешне, было б крыўдна пазбавіцца гэтага шанцу.

«Паспяховае выступленне навучэнцаў на рэспубліканскай алімпіядзе патрабуе інтэлектуальнай спеласці, камунікабельнасці, здольнасці арыентавацца ў незнаёмай абстаноўцы, умення хутка ацэньваць новую інфармацыю і канцэнтравацца на выкананні пастаўленай задачы, — падкрэсліваюць у Міністэрстве адукацыі. — Усе гэтыя якасці з'яўляюцца ўмовамі канкурэнтаздольнасці навучэнцаў. Таму зараз разглядаецца магчымасць уключэння ў склад абласных каманд, каманды Мінска і Ліцэя БДУ для ўдзелу ў заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды ў 2021 годзе навучэнцаў VIII, IX і X класаў, якія перамаглі ў абласных турах і павінны былі выступіць у заключным рэспубліканскім этапе сёлета».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ДЫНАСТЫЯ ЕРАМЕЯ

**Падпалкоўнікаў міліцыі Наталлю НАГОРНУЮ і Вікторыю НЯЧАЕВУ шмат што аб'ядноўвае. Яны родныя сёстры, абедзве працуюць у Магілёўскім інстытуце МУС і з'яўляюцца прадаўжальніцамі міліцэйскай дынастыі, якая, лічы, равесніца Перамогі. Заснавальнікам стаў іх мужны дзед, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, камандзір партызанскай разведроты, адзін з ліквідатараў буйной банды Пялінка, якая ў апошні год вайны бясчынствавала ў Полацкім раёне. Сёстры не маглі выбраць іншую прафесію, бо ўсё жыццё раслі на прыкладах сваіх продкаў-франтавікоў — Ерамея і Праскоўі Курчанкаў. А яшчэ маці — Ліліі Хортавай. Яна ў іх, дарэчы, таксама падпалкоўнік міліцыі.**



**Ерамей Курчанка заўсёды лічыў Дзень Перамогі галоўным святам. 2006 год.**



**Бабуля Праскоўя Курчанка.**

## ПЕРШЫ БОЙ

Гераічнага дзеда Ерамея няма ў жывых ужо 10 гадоў, яшчэ раней пайшла з жыцця яго верная спадарожніца Праскоўя. Але памяць аб іх у сям'і захоўваецца і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Наталля Нагорная напісала вялікую работу па ўспамінах сваіх дзеда і бабулі для інстытута. Там шмат цікавых фактаў з іх біяграфіі. Напрыклад, як у дыверсійную спецшколу, дзе вучыўся Ерамей Курчанка, прыязджаў першы сакратар ЦК КПБ Панцеляймон Панамарэнка. Менавіта ад яго малады камандзір разам з іншымі таварышамі па службе атрымаў загад весці бязлітасную барацьбу з акупантамі. І гэта іх, маладых чырвонаармейцаў, вельмі натхніла. Быў 1942 год, а перад гэтым Ерамей Курчанка паспеў паваяваць і атрымаць сур'ёзнае раненне.

— Вайну дзед сустрэў у вайсковых лагерах «Чырвоныя стругі» пад Псковам, дзе служыў памочнікам камандзіра ўзвода 3-га маталызаванага палка, — кажа Наталля. — Ён часта расказваў нам, як усё пачыналася. У той дзень ён быў дзяжурным па палку. На досвітку са штаба дывізіі да іх прыехаў сувязны з пакетам. Сказаў, што павінен перадаць яго непасрэдна ў рукі камандзіру, пад подпіс. Калі камандзір разарваў пакет і прачытаў, ён закрычаў: «Абвяшчаем трывогу! Баявую! Вайна!» А 23 чэрвеня полк ужо ўступіў у свой першы бой. З роты, дзе служыў дзед, засталася толькі чвэрць байцоў. Адыходзілі з баямі. У адным з іх пад Псковам дзед атрымаў сур'ёзнае раненне. Каля паўгода правёў у шпіталі, выйшаў з яго на мыліцах з заключэннем, што «абмежавана прыдатны да стравой службы ва Узброеных Сілах».

Пэўны час Ерамей Курчанка рыхтаваў вучэбныя роты кулямётчыкаў, а ў красавіку 1942-га быў накіраваны на спецыяльныя курсы па падрыхтоўцы кадраў для партызанскіх атрадаў і арганізатарскіх груп у Мураме. Гэтыя курсы насілі назву Асобага беларускага збору, бо там было шмат беларусаў. Яны асвойвалі тактыку партызанскай барацьбы, стралковую зброю, займаліся вывучэннем падрыўной справы, тапаграфіі, практыкаваліся ў стральбе, вучыліся знішчаць сродкі сувязі, транспарту, падпальваць склады, базы, граміць штабы і камандныя пункты,



**Сямейная дынастыя: Вікторыя НЯЧАЕВА, Лілія ХОРТАВА і Наталля НАГОРНАЯ.**

разбураць чыгункі, ладзіць аварыі варожых воінскіх эшалонаў...

## ІХ ПАЗНАЁМІЛА ВАЙНА

Вайна перавярнула жыццё людзей: шмат у каго забрала родных, а вось Ерамею з Праскоўяй пашчасціла знайсці адзін аднаго.

— Мае дзед і бабуля сустрэліся менавіта на вайне, — расказвае сямейную гісторыю Наталля. — Пасля дыверсійнай спецшколы ў Мураме дзед быў прызначаны камандзірам адной са ста дыверсійных груп, якія былі накіраваны ў розныя куткі Беларусі. За два дні да адправкі ў яго групу была камандзіравана Праскоўя Дзямідава — таксама слухачка падобных курсаў, але ў Маскве. Яна потым і стала яго жонкай. Разам яны ішлі да месца дыслакацыі ў Клімавіцкія лясы. Там яны аб'ядналіся з групай Уладзіміра Маркава, іх агульны атрад называўся «За Радзіму». Дзед у ім быў камандзірам разведроты. У яе ўваходзіла і мая бабуля. Ён неаднойчы яе ратаваў. Яшчэ тады, калі яны ішлі да пункту прызначэння, даводзілася, як яны ўспаміналі, пераадольваць шмат рэк і рачулак. У адной з іх танула Праскоўя, а ён яе выцягнуў.

А аднойчы Праскоўя ледзь не загінула падчас выканання баявой аперацыі па падрыве чыгункі. Немцы ўздоўж дарогі спілавалі ўвесь лес, засталіся адны пні і кусты. Калі дыверсанты ўжо зрабілі сваю справу і ішлі ў лес, Праскоўя заблыталася ў хмызах і не магла самастойна вызваліцца. Яна ўжо развіталася з жыццём, калі яе хапіліся, і Ерамей сам на кані прыскакаў на яе пошукі.

— Гэта было сапраўднае каханне, яны не мелі нічога з матэрыяльнага, нейкай там маёмасці. Яны жылі пачуццямі. Я памятаю, як пара расказвала, што, калі ажаніліся, на адным шынялі спалі, другім накрываліся, — расказвае Наталля. — Яны яшчэ ў партызанскім атрадзе вырашылі, што калі выжывуць, то застануцца разам. Так і выйшла. Разам яны прайшлі цяжкія ваенныя гады, у шлюбе пражылі 56 шчаслівых гадоў мірнага жыцця.

## ПРАФЕСІЮ ВЫБІРАЛІ АСЭНСАВАНА

У верасні 1943-га, калі вызвалялі Клімавіцкі раён, у партызанскім атрадзе «За Радзіму» было ўжо больш за 500 чалавек, хоць усё пачыналася з некалькіх дзясяткаў.

За пяць месяцаў 1943 года разведрота Ерамея Курчанкі падарвала шэсць варожых эшалонаў, 220 рэек, пашкодзіла сем кіламетраў сувязі, у баях і засадах знішчыла 120 гітлераўцаў. За свой баявы шлях у гады Вялікай Айчыннай Ерамей Мікалаевіч быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «Партызану Вялікай Айчыннай вайны I ступені». Яго жонка Праскоўя таксама атрымала баявы медаль «Партызану Вялікай Айчыннай вайны I ступені».

Пасля вызвалення Клімавіцкага раёна Ерамей і Праскоўя засталіся ў Клімавічах. Тут і пачалася міліцэйская біяграфія Ерамея Курчанкі. У 1944 годзе ён у складзе 75 супрацоўнікаў міліцыі Магілёўшчыны быў накіраваны для барацьбы з буйным бандфарміраваннем у Полацкую вобласць. Шмат хто не вярнуўся пасля гэтага на радзіму. Але Ерамею Мікалаевічу пашчасціла. З 1948 года і да самага звальнення ў запас працаваў у Касцюковіцкім РАУС.

— Дзед шмат расказваў пра тое, як быў участковым, — успамінае Наталля. — Яму даводзілася выступаць і за следчага, і за оперупаўнаважанага. Абслугоўваў аж 67 населеных пунктаў! Не дзіўна, што мы з сярэдняй сястрой выбралі гэтую прафесію. А вось малодшая, Марыя Чухонская, стала ўрачом. Таксама адказная пасада. Асабліва зараз. Дзед наказваў нам заўсёды працаваць сумленна, не браць ніякіх падзяк і падачак. Казаў, лепш агурок з бульбай, чым здзелкі з сумленнем. Яго дачка, наша маці, Лілія Хортава, 26 гадоў аддала службе ў органах унутраных спраў.

## СЯМЕЙНЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Медалі, узнагародныя лісты бабулі і дзеда — усё гэта беражліва захоўваецца ў дамашнім архіве Наталлі, яе сясцёр і маці. Падчас пераездаў шмат трафейных рэчаў часоў вайны было страчана. Лілія Ерамееўна згадала, што ў маці быў нават дамскі пісталет вальтэр, але яна выкінула ў рэчку, калі да яго стаў праяўляць цікавасць яе сын. Але галоўнае не рэчы, а тое, што жыве памяць. Лілія Ерамееўна, калі вучылася ў ВНУ, пісала курсавую работу па гісторыі партызанскага атрада, дзе ваявалі яе бацькі. Успамінамі пра сустрэчы дзеда і бабулі з аднапалчанамі падзялілася і Наталля:

— Дзед з бабуляй штогод ездзілі ва ўрочышча Харавынь, дзе ваявалі, на сустрэчы з аднапалчанамі, і мяне аднойчы ўзялі. Я была зусім яшчэ падлеткам — усяго 10 гадоў. Але вельмі добра памятаю тыя зямлянкі, баявую паляну, дзе ветэраны збіраліся і ўспаміналі былое. Сядзелі да самай цемры. На сустрэчы прыязджаў і камандзір атрада Уладзімір Маркаў, які потым стаў генералам. Засталося шмат фотаздымкаў з тых сустрэч.

Для Наталлі, яе маці і сясцёр свята Перамогі — асаблівая дата.

— Маці мне казала, што ўвесь ваенны час марылі: калі выжывуць, большага свята ў нас не будзе, — кажа Лілія Ерамееўна. — Галадаць ёй даводзілася доўга. Марыла нават пра бульбяныя лупіны. Казала, што, калі б нехта тады даў іх наесца ўволю, рукі б цалавала.

Наталля і яе сястра Вікторыя жывуць у Магілёве, а вось маці часта бывае ў бацькоўскім доме ў пасёлку Мірны Магілёўскага раёна. У памяць аб Перамозе Лілія Хортава заўсёды напярэдадні свята вывешвае сцяг. Гэта самая галоўная традыцыя, якую захоўвалі яе бацькі і Лілія прывівае сваім дзецям. І яны абяцаюць яе таксама захаваць.

— Мы нізка схіляемся не толькі перад нашымі роднымі, але і ўсімі ўдзельнікам той вайны, — кажа Наталля. — У нашай сям'і да слаўнага мінулага продкаў ставяцца і будуць ставіцца з гонарам і хваляваннем! І гэтыя пачуцці мы перадаём зараз сваім дзецям.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Наталлі НАГОРНАЙ.**

---

Яўгена ПЯСЕЦКАГА ФОТА СЛОВА



Гэты невялічкі помнік — каменная пліта са слядамі ног, акружаная шаўкавістай вясновай травой і стракатымі майскімі кветкамі, знаходзіцца ў самым цэнтры Мінска. Фотаздымкі ваенных часоў сведчаць, што на гэтым месцы фашысцкія акупанты каралі смерцю савецкіх патрыётаў. На гэтым месцы стаялі бясстрашныя змагары за незалежнасць Радзімы перад тым, як зрабіць свой апошні крок у Вечнасць.

*Пралятаюць няспынна гады,*
*Веснавымі жывяць ручаямі.*
*На далонях каменнай пліты*
*Не знікаюць ніколі сляды,*
*Ні пад ліўнямі, ні пад снягамі.*

*З часам зменіцца шмат на зямлі —*
*Стануць камні пяскам ля дарогі,*
*Але Памяць — жывая заўжды*
*Пра ўсіх, хто пакінуў сляды*
*На шляхах да святой Перамогі.*



## БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк Беларусбанк» проводит открытый аукцион по продаже имущества

**Наименование объекта продажи:**

# ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ

**с инвентарным номером 240/D-51291, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Мира, 62-58, площадью 34,0 м$^2$.**

Начальная цена продажи составляет 12 000,00 руб., в том числе НДС по ставке 20 %.

**Аукцион состоится 20 мая 2020 г. в 11.00**
**по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10Б, первый этаж, актовый зал.**

Для участия в аукционе необходимо подать заявление и документы на участие в аукционе, а также перечислить задаток в срок не позднее 18 мая 2020 года до 12.00.

Задаток в сумме 1 200,00 белорусских рублей должен быть зачислен на счет BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

Заявления и документы на участие принимаются в рабочие дни в срок **до 18.05.2020 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10Б, кабинет 0.1.**

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Особые условия: победителем аукциона возмещаются расходы, связанные с публикацией в СМИ в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

**Дополнительная информация по тел.:**
**(0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4Б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов – капитальное строение, расположенное по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114**

| Наименование (назначение) | Инв. номер | Общ. площадь |
|---|---|---|
| **Гаражи на 4 автомашины** (Здание нежилое) | 102/С-9461 | 89,3 кв. м |

**Сведения о земельных участках:** пл. 0,0245 га, предоставлен на праве аренды сроком по 31.12.2114 для обслуживания здания гаража на 4 автомашины

**Начальная цена (с НДС 20 %): 8 520,00 белорусского рубля**

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни с 08.00 до 17.00 +375 (33) 673 28 47 (Мизюк Наталья Леонтьевна)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20 (двадцать) рабочих дней** после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, а также оплатить организатору торгов вознаграждение в размере 3 (трех) процентов от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» 14.02.2020 г.

Оплата государственной пошлины за государственную регистрацию договора купли-продажи производится покупателем

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 10.00 19.05.2020** **Окончание торгов: 12.00 19.05.2020** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.05.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(организатор аукциона)**
**информирует о проведении открытого аукциона**

# ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ КАФЕ,

**принадлежащего ООО «Квантион», 644/С-56438, 473,1 кв. м, Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Козлова, 30Б.**

Земельный участок 625050100001002723 площадью 0,0300 га.
Начальная цена без НДС – 1 228 500,90 руб.

**Аукцион состоится 08.06.2020 в 11.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте организатора аукциона ino.by.

УНП 190055182

---

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 19 мая 2020 г. в 10.00 повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 15 % после первых несостоявшихся торгов по продаже автотранспортного средства, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Электроаппаратура» на праве собственности

| № лота | Наименование, краткая характеристика объекта | Начальная цена, рубля (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, рубля (в т. ч. НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | Легковой автомобиль **ТОЙОТА КЭМРИ**, инв. № 12285, регистрационный знак 1001 АТ-3, транзитный номер 3ЕС Т 8448, год выпуска – 2006. Тип: легковой седан. Цвет: черный. Номер кузова (рамы): JTNBE40K303052672. Объем двигателя: 2400 см$^3$. Вид топлива: бензин. Коробка передач автоматическая. Пробег – более 240 тыс. км. Механических и прочих повреждений не имеет. Находится в технически исправном состоянии | **13 819,78** | **1 300,00** |

Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 18.05.2020 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **19.05.2020 г**.

Фэйкі, якія распаўсюджваюць ілжывую інфармацыю з нагоды сітуацыі з каранавірусам у Беларусі, недапушчальныя. Аб гэтым журналістам паведаміла старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. Яна выказалася з прычыны таго, як асвятляюць сітуацыю з COVID-19 у Беларусі некаторыя замежныя СМІ.

— Фэйк, ілжывая інфармацыя, якую даюць некаторыя тэлекампаніі і каналы, — гэта проста недапушчальна.

Спікер падкрэсліла, што эпідэміялагічная сітуацыя ў краіне рэгуляваная і кіраваная. Зыходзячы з гэтага, было вырашана не адмаўляцца ад правядзення святочных мерапрыемстваў да 75-годдзя Вялікай Перамогі.

— Мы не можам здрадзіць памяці людзей, якія загінулі, абараніўшы свабоду і незалежнасць нашай краіны, здрадзіць ветэранам, якія кажуць пра тое, што мы павінны адзначаць гэтае свята. Беларусы павінны быць разам для таго, каб ушанаваць памяць загінулых і сказаць словы падзякі, нізка пакланіцца тым, хто абараніў свабоду і незалежнасць, аднавіў краіну ў пасляваенны час, — падкрэсліла Наталля Качанава.

**Паводле БелТА.**

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

## Сенатары абмеркавалі навацыі закона аб абароне інтэлектуальнай уласнасці

**Круглы стол на тэму «Удасканаленне палажэнняў Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб інтэлектуальнай уласнасці», арганізаваны не так даўно Пастаяннай камісіяй Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, прайшоў у анлайн-рэжыме.**

Да абмеркавання былі запрошаны сенатары, прадстаўнікі Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці, Мінэканомікі, Вярхоўнага Суда, юрыдычнай супольнасці, а таксама эксперты. Дарэчы, пытанні інтэлектуальнай уласнасці невыпадкова аказаліся ў цэнтры ўвагі — цяпер распрацоўваецца праект закона «Аб змене кодэксаў», большая частка якога прысвечана зменам у Грамадзянскім кодэксе (*далей — ГК*). Адзначым, што раздзел V гэтага дакумента, прысвечаны менавіта інтэлектуальнай уласнасці, падаецца цалкам у новай рэдакцыі. Гэта звязана з тым, што за больш чым 20 гадоў дзеяння ГК у заканадаўстве аб інтэлектуальнай уласнасці не адбылося істотных змен. У хуткім часе законапраект будзе накіраваны ў парламент.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Віктар ЧАЙЧЫЦ,** адкрываючы пасяджэнне круглага стала, падкрэсліў неабходнасць абмеркавання праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць пры стварэнні і выкарыстанні аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, а таксама перспектыў далейшага ўдасканалення заканадаўства ў гэтай сферы.

У прыватнасці, удакладняецца пералік аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, у які ўключаны творы, вынаходніцтвы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, сарты раслін і пароды жывёл, тапалогіі інтэгральных мікрасхем. Таксама называюцца выпадкі, калі асобы не могуць прэтэндаваць на аўтарства (суаўтарства) вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці. Гаворка ідзе пра асоб, якія не зрабілі асабістага творчага ўнёску, гэта значыць аказалі толькі тэхнічную, кансультацыйную, арганізацыйную або матэрыяльную дапамогу або паспрыялі афармленню правоў на такі вынік.

Таксама замацоўваецца норма аб тым, што адсутнасць забароны з боку праваўладальніка не азначае згоды на выкарыстанне. Упершыню ў айчынным заканадаўстве прапаноўваецца замацаваць прэзумпцыю творчага характару дзейнасці, якая прывяла да стварэння твора.

Акрамя таго, прадугледжваецца павелічэнне тэрміну дзеяння выключнага права на творы пасля смерці аўтара з 50 да 70 гадоў. Істотныя змены закранаюць нормы, прысвечаныя абароне фірменных найменняў. У якасці суб'екта такога наймення прапануецца вызначыць толькі юрыдычную асобу, якая з'яўляецца камерцыйнай арганізацыяй. Права выкарыстання фірменнага наймення можа перадавацца іншай асобе па дагаворы франчайзінгу.

Актыўны ўдзел у абмеркаванні палажэнняў законапраекта, якім уносяцца змены ў ГК, узяў прафесарска-выкладчыцкі склад устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі. Так, прадстаўнікі кафедры прававых дысцыплін Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь прапанавалі ўключыць у пералік аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці камерцыйную тайну і дапоўніць ГК нормамі аб інфармацыйным пасярэдніцтве.

З боку кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ прагучала прапанова аптымізаваць у раздзеле 5 ГК шэраг артыкулаў, а таксама ўдакладніць паняцці ліцэнзійнай дамовы і дамовы саступкі выключнага права.

Прадстаўнікі юрыдычнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта закранулі пытанні кадыфікацыі заканадаўства аб інтэлектуальнай уласнасці, прававой аховы мультымедыйных твораў, а таксама аховы правоў на камп'ютарныя праграмы.

Прадстаўнік юрыдычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы прапанаваў удакладніць нормы артыкула 982 ГК аб маёмасных і асабістых немаёмасных правах на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці.

Дыскусія разгарнулася вакол новай рэдакцыі артыкула 1018 ГК аб тэрміне дзеяння пасведчання на таварны знак. Згодна з праектам, гэты тэрмін складае дзесяць гадоў і вылічваецца з даты паступлення заяўкі ў патэнтны орган. Удзельнікі круглага стала прапанавалі весці гаворку пра тэрмін дзеяння выключных правоў, а не тэрмін дзеяння пасведчання, бо выключнае права першаснае ў адносінах да дакумента, які засведчвае гэта права.

Падводзячы вынікі круглага стала, Віктар Чайчыц звярнуў увагу на шырокае кола праблем, якія на ім абмяркоўваліся, і прапанаваў усім зацікаўленым накіраваць у Пастаянную камісію прапановы па ўдасканаленні нормаў Грамадзянскага кодэкса ў сферы інтэлектуальнай уласнасці.

«Усе прапановы будуць акумуляваны намі сумесна з Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў і па магчымасці ўлічаны пры рабоце над законапраектам, у тым ліку пасля паступлення яго на разгляд у парламент», — рэзюмаваў Віктар Чайчыц.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

ФОТАФАКТ

# ДЗЯКУЙ ЗА ПЕРАМОГУ!

Старшыня Матыкальскага сельсавета Уладзімір ЛЕТАШКОЎ віншуе з надыходзячым святам ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Надзею ПЛАХОТНУЮ. Разам з прадстаўнікамі Брэсцкага райвыканкама, раённай арганізацыі прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу і цэнтра абслугоўвання насельніцтва кіраўнік сельсавета ўручыў жанчыне юбілейны медаль «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў».



Фота БелТА.

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# Каго чакае меншае пакаранне?

**Сенатары пагадзіліся з Законам «Аб амністыі», прымеркаваным да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Здавалася б, што ў ім можа быць новага? Аналагічныя законапраекты разглядаюцца штогод, але навацыі ёсць.**

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў папярэдне разгледзелі законапраект у двух чытаннях і прынялі яго. Наступны крок — ухваленне з боку членаў Савета Рэспублікі.

Законапраект сенатарам прадставіў **міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ,** які паведаміў, што, па папярэдніх звестках, ад рознага віду пакаранняў будуць вызвалены 5372 асуджаныя, у тым ліку з месцаў пазбаўлення волі — 1985 чалавек, з выпраўленчых устаноў адкрытага тыпу — 727, з крымінальна-выканаўчых інспекцый — 2660.

Акрамя таго, плануецца скараціць тэрмін пакарання 6400 асуджаным.

Як расказаў журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ,** закон аб амністыі — прагрэсіўны крок наперад на шляху ўдасканалення крымінальна-прававой палітыкі дзяржавы.

— Навацыяй з'яўляецца тое, што да катэгорыі такіх асоб нароўні з грамадзянамі, якія і раней траплялі пад амністыю (а гэта інваліды I і II груп, анкахворыя і ВІЧ-інфіцыраваныя, непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, адзінокія матулі ці бацькі, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў і іншыя) дададзеца шэраг іншых людзей, якія раней не ўваходзілі ў лік тых, хто мае права на амністыю, — паведаміў сенатар.

Ён растлумачыў, што на год будзе скарочана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі асобам, якія здзейснілі карупцыйныя злачынствы.

Нагадаем, у папярэдняй амністыі, якая была год таму, гэтая катэгорыя асоб не трапіла ў спіс тых, хто мог на яе разлічваць.

Суразмоўнік прывёў яшчэ адзін прыклад паслаблення пакарання: непаўналетнія асуджаныя па справах, звязаных з распаўсюджваннем наркатычных сродкаў (па частцы 4 і 5 артыкула 328 Крымінальнага кодэкса) таксама атрымалі права на амністыю — скарачэнне тэрміну пазбаўлення волі на год.

— І гэта таксама з'яўляецца прагрэсіўным крокам у частцы распаўсюджвання закона аб амністыі на шырэйшае кола суб'ектаў, — падкрэсліў Сяргей Сівец.

На думку старшыні профільнай камісіі, цяперашні закон прагрэсіўны і ў тым сэнсе, што не толькі рэгламентуе пазбаўленне ад крымінальнай адказнасці і пакарання, але і разглядае пытанні рэсацыялізацыі, рэабілітацыі і адаптацыі грамадзян, вызваленых з месцаў пазбаўлення волі. У прыватнасці, мясцовым органам улады даручана правесці комплекс бытавых, сацыяльна-адукацыйных, медыцынскіх мерапрыемстваў, звязаных з вяртаннем амніcціраваных грамадзян у соцыум, наданнем ім магчымасці цалкам рэабілітавацца і не вярнуцца зноў на шлях злачынства.

Між іншым, як паведаміў міністр унутраных спраў Юрый Караеў, амністыя не распаўсюджваецца на асоб, у адносінах да якіх у перыяд 2015—2020 гадоў прымяняліся амністыя ці памілаванне і якія зноў учынілі наўмыснае злачынства ў перыяд непагашанай судзімасці, якія цалкам не пакрылі матэрыяльную шкоду, на злосных парушальнікаў парадку адбывання пакарання, а таксама тых, хто дапусціў асабліва небяспечны рэцыдыў злачынства, і некаторых іншых.

# Без права на... новае крэсла

## Кіраўнікі, якія былі звольнены па дыскрэдытуючых абставінах, не змогуць атрымаць высокія пасады

**Члены Савета Рэспублікі прынялі да ведама Дэкрэт № 1 «Аб зменах дэкрэтаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» ад 9 красавіка 2020 года, накіраваны на прынядце дадатковых мер супраць так званага перасаджвання звольненых вінаватых кіраўнікоў на іншыя дастаткова высокія месцы.**



Фота БелТА.

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** растлумачыла сенатарам, што змены накіраваны на ўдасканаленне асобных накірункаў у рабоце з кадрамі.

Так, змены закранаюць Дэкрэт № 5 «Аб узмацненні патрабаванняў да кіраўнічых кадраў і работнікаў арганізацый». Мэтай нававядзенняў з'яўляецца безумоўнае выкананне патрабаванняў лідара краіны аб недапушчэнні выпадкаў перасаджвання кіраўнікоў, вызваленых ад пасад па дыскрэдытуючых абставінах.

У прыватнасці, Дэкрэт № 5 дапоўнены нормай, якая замацоўвае абавязак Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Міністраў, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, гар- і райвыканкамаў, мясцовых адміністрацый праводзіць на працягу пяці гадоў маніторынг працаўладкавання вінаватых кіраўнікоў.

— Прыняцце змен у Дэкрэт № 5 дазволіць больш эфектыўна выбудаваць работу дзяржаўных органаў па захаванні забароны на займанне кіраўнічых пасад асобамі, якія раней былі вызвалены ад высокіх пасад па дыскрэдытуючых падставах, а ў выпадку выяўлення фактаў перасаджвання — своечасова прыцягваць да адказнасці асоб, вінаватых у парушэнні патрабаванняў Дэкрэта № 5, — растлумачыла міністр.

На важнасць навацыі па маніторынгу далейшага працаўладкавання былых кіраўнікоў звярнуў увагу і **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.**

Акрамя таго, згодна з Дэкрэтам № 1 шэраг дзеючых дэкрэтаў кіраўніка дзяржавы прыводзяцца ў адпаведнасць з навацыямі закона па пытаннях удасканалення працоўных адносін ад 18 ліпеня 2019 года. Яны адкарэктаваны, зыходзячы са змен у Працоўны кодэкс, у тым ліку з уключэннем у яго палажэнняў аб выкарыстанні кантрактнай формы найму.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# Адноўлены мемарыял

**Маштабным падарункам да 9 Мая стане адкрыццё ў Дубровенскім раёне пасля капітальнай рэканструкцыі аднаго з найбуйнейшых ва ўсёй краіне мемарыяльных комплексаў «Рыленкі».**



Фота Дзмітрыя ОСІПАВА.

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ,** каардынатар правядзення работ, што працягваліся каля двух гадоў, нядаўна ўзначаліў чарговае пасяджэнне будаўнічага штаба. У размове з карэспандэнтам «МС» кіраўнік абласнога парламента адзначыў, што ў Дзень Перамогі ў «Рыленках» адбудзецца ўрачыстае мерапрыемства з удзелам кіраўніцтва вобласці.

Безумоўна, гэтае месца памяці стала народнай будоўляй. Яно было ў цэнтры ўвагі дэпутацкага корпуса не толькі Дубровенскага раёна. Пры гэтым, зразумела, народныя выбраннікі курыравалі, каардынавалі, дапамагалі прывядзенню ў парадак абеліскаў на тэрыторыях, дзе жывуць іх выбаршчыкі.

«Рыленкі» стварылі ў 1973 годзе. Такім чынам тады адзначалі адно з месцаў пачатку аперацыі «Баграціён». Мемарыяльны комплекс — над брацкай магілай, дзе пахавалі прыблізна 10 тысяч вызваліцеляў (дакладная лічба невядомая) з 11-й гвардзейскай і 31-й армій. Яны аддалі свае жыцці ў перыяд з сярэдзіны восені 1943 года да чэрвеня 1944-га.

Уладзімір Цярэнцьеў адзначыў, што за апошнія гады дзякуючы даследчыкам гісторыі роднага краю, пашукавікам у мемарыяле ўвекавечылі каля 2,5 тысячы прозвішчаў герояў.

Мемарыял гэты ўнікальны. Згадаем некалькі фактаў. У «Рыленках» ёсць рэдкі на тэрыторыі былога СССР помнік медыка-санітарнаму батальёну (251-й стралковай дывізіі). Тут можна даведацца пра гібель лётчыкаў слаўтага авіяцыйнага палка «Нармандыя—Нёман» Бруна дэ Фальтана і Сяргея Астахава. Таму па-асабліваму ставяцца да беларускага мемарыяла ў Францыі.

Вядома, мемарыял штогод рамантавалі, але час быў мацнейшы за людскія намаганні. За дзесяцігоддзі надмагіллі страцілі належны выгляд. Іх трэба было аднавіць у адной стылістыцы.

За два гады на аб'екце было зроблена вельмі многае. Комплекс нібыта перамясціўся ў часе. Захаваўшы знешнія контуры, не парушыўшы задумы архітэктараў і скульптараў, «Рыленкам» надалі новае жыццё.

На рэканструкцыю выдаткоўваліся грошы з раённага, абласнога бюджэтаў, са сродкаў, зробленых на суботніках. Прыблізны яе кошт — каля 1,5 мільёна рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ПРАЕКТ

# РАДКІ ПАМЯЦІ

## Як парламентарыі, ветэраны і вядомыя артысты з краін СНД разам чытаюць вершы пра вайну

**Да 75-годдзя Перамогі Міжпарламенцкая Асамблея СНД запусціла спецыяльны праект «Радкі памяці» — серыю ролікаў з паэтычнымі відэапасланнямі ад краін Садружнасці. У кожным з ролікаў вершы нацыянальных паэтаў, якія прысвечаны вайне, разам з парламентарыямі чытаюць ветэраны, вядомыя пісьменнікі, музыканты, спартсмены, журналісты і студэнты дзевяці краін Садружнасці. Далучыцца да гэтага праекта можа кожны.**

Ініцыявала яго Маладзёжная парламенцкая асамблея краін СНД, а падтрымала старшыня Савета Міжпарламенцкай асамблеі краін — удзельніц СНД, Старшыня Савета Федерацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Валянціна Мацвіенка, паведамляе прэс-служба МПА. Да ініцыятывы далучыліся парламентарыі, прадстаўнікі старэйшага пакалення, вядомыя навукоўцы і зоркі шоу-бізнесу Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана і Узбекістана.

Ад нашай краіны ў праекце паўдзельнічалі старшыня Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў Анатоль Адоньеў, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Марына Васько, алімпійскі чэмпіён, член Маладзёжнай міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД у 2018—2019 гадах Аляксандр Багдановіч і студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Кацярына Дзябёлая. Разам яны прачыталі ўрывак з верша Аркадзя Куляшова «На Мінскай шашы», які быў напісаны ў 1941 годзе.

Дарэчы, паглядзець усе ролікі можна на сайце МПА СНД і на старонках Міжпарламенцкай асамблеі ў сацыяльных сетках.

— Праект Маладзёжнай асамблеі невыпадкова атрымаў жывы водгук у краінах Садружнасці. У ім закладзены важныя для нашых дзяржаў каштоўнасці. Вялікі подзвіг савецкага народа, які ў найцяжэйшай барацьбе ў адзіным шэрагу атрымаў Перамогу над фашызмам, — гэта наш агульны здабытак і гонар, агульная памяць і боль, наша галоўная спадчына. Важна і тое, што «Радкі памяці» таксама дазволяць самай шырокай аўдыторыі пазнаёміцца з творчасцю нацыянальных паэтаў і даведацца аб славутых сучасніках з краін Садружнасці, — адзначыў **генеральны сакратар МПА СНД Дзмітрый КАБІЦКІ.**

Ён выказаў надзею на тое, што да праекта далучацца жыхары розных краін, у першую чаргу моладзь, і распачатая парламентарыямі СНД паэтычная эстафета памяці будзе працягвацца.

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

Віктар ЛІСКОВІЧ:

# «Неабходна захаваць гістарычную праўду пра вайну»

**Пра тое, як супрацьстаяць фальсіфікацыі гісторыі, што значыць Вялікая Перамога для асобна ўзятай сям'і і як захаваць гістарычную праўду пра вайну, у інтэрв'ю «МС» расказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.**

***— Віктар Андрэевіч, 75-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне — асаблівая дата. Вайна не абышла, мабыць, ніводную беларускую сям'ю. Яна паказала непахіснасць характару нашых людзей, іх волю да свабоды і мірнага жыцця. Што для вас асабіста значыць гэтая дата? Падзяліцеся, калі ласка, гісторыяй сваёй сям'і.***

— Наша краіна панесла вялізарныя страты падчас вайны: загінуў кожны трэці жыхар. Беларуская зямля першая прыняла ўдар нацысцкай арміі. Тут праходзілі маштабныя бітвы і ваенныя аперацыі, сярод якіх — геаічная абарона Брэсцкай крэпасці і адна з найбуйнейшых наступальных аперацый Чырвонай Арміі «Баграціён». На тэрыторыі Беларусі дзейнічала каля 40 партызанскіх злучэнняў, у падпольных арганізацыях супрацьстаяла ворагу больш за 70 тысяч чалавек. Гэта была сапраўды народная вайна.



Нашы салдаты самааддана змагаліся, каб краіна была вольная, мірная і квітнела. Аб гэтым ні ў якім разе нельга забывацца. Мы пра гэта памятаем і хочам, каб памяталі будучыя пакаленні.

Практычна ўсю вайну мае бабулі і дзядулі змагаліся ў шэрагах партызан. Мой дзед па лініі бацькі, Лаўрэнцій Пятровіч, шыў для партызан кажухі. Калі ў 1944 годзе Беларусь вызвалілі, яго забралі ў дзеючую армію, і ён дайшоў да Будапешта, дзе быў паранены. Затым служыў у сапёрным палку, быў перадыслакаваны ў вайсковую часць у раён Японскага фронту, дзе скончыў службу ў студзені 1946 года.

Дзед па маці загінуў 21 красавіка 1945 года, пахаваны ў Берліне.

Бацькі шмат расказвалі пра вайну, пра тое, як наша сям'я дапамагала партызанам, хоць гэта і было рызыкоўна. Добра памятаю, напрыклад, аповед пра палоннага немца, якога партызаны прывялі на хутар бацькоў маёй маці. Гэта было ў Кобрынскім раёне. Прыйшлі, каб перадыхнуць, папрасіць ежы. Немец паспрабаваў збегчы, але яго злавілі. Уявіце, калі б яму ўдалося ўцячы: усіх на хутары маглі б забіць. Але пра гэта мала тады думалі. Людзі, як маглі, падтрымлівалі партызан, такіх прыкладаў было шмат.






Сёння ўсе ўзнагародныя дакументы майго дзеда захоўваюцца ў нашай сям'і як рэліквія. Добра ведаюць гісторыю вайны мае дзеці. Мая ўнучка, якая вучыцца ў 5 класе, удзельнічае ў розных патрыятычных акцыях, выкарыстоўваючы ўспаміны пра вайну, якія засталіся ад прабабуль і прадзядуляў. Памяць аб вайне для нас — гэта сямейная традыцыя. Мяркую, што гэтак жа сама да яе ставяцца і многія іншыя беларусы.

***— Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны сёння, як мы бачым, — гэта не толькі тэма памяці. Яна выкарыстоўваецца для развязвання палітычных спрэчак, росту міжнароднай напружанасці. Робяцца спробы перагляду прычын і вынікаў вайны. На ваш погляд, як супрацьстаяць такой фальсіфікацыі і захаваць гістарычную праўду пра вайну?***

— Асобныя замежныя палітыкі і грамадскія дзеячы робяць часам гучныя заявы, спрабуючы абясцэніць ролю савецкага народа ў перамозе над фашызмам, змяняюць акцэнты, прыводзяць нібыта новыя факты пра вайну, часцяком працуючы на публіку, каб дагадзіць пэўным палітычным інтарэсам. Такім чынам яны зарабляюць сабе балы, імкнуцца вылучыцца на фоне астатніх. Усе мы выдатна разумеем, навошта гэта робіцца.

Безумоўна, неабходна рэагаваць на такія інфармацыйныя ўкіды. А для гэтага трэба пастаянна казаць, пісаць пра ход вайны, перамогі, тыя факты, якія мы маем. Рабіць гэта не ад выпадку да выпадку, а на сістэмнай аснове, перш за ўсё праз сродкі масавай інфармацыі, а таксама сацыяльныя сеткі, дзе так шмат нашай моладзі. Другая крыніца інфармацыі — гэта кнігі.

Прывяду ўласны прыклад. У маладосці мяне вельмі цікавіла гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, я шмат чытаў. Самыя любімыя былі кнігі з успамінамі і разважаннямі нашых вядомых савецкіх палкаводцаў: Жукава, Васілеўскага і іншых. Чытаў і мемуары пра партызанскі рух у Беларусі. Калі чытаеш гэтыя кнігі, адчуваеш усё ад першай асобы — настолькі праўдзіва і дакладна ў іх выкладзены падзеі. Гэта тое, што захоўвае гістарычную праўду. Акрамя таго, любая кніга пра вайну вучыць цаніць міры.

***— Сёння шмат хто кажа пра тое, што трэба ўдасканальваць падыходы ў рабоце з моладдзю. Чаго не хапае сістэме патрыятычнага выхавання, каб яна працавала сапраўды эфектыўна?***

— Дзяцей трэба вучыць шанаваць сваю гісторыю, у тым ліку ўнёсак нашага народа ў Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, з ранніх гадоў — пачынаць з дзіцячага садка, пачатковай школы. Калі з гэтымі ведамі дзеці пераходзяць на наступны ўзровень адукацыі, а гэта 5 клас, яны лепш разумеюць тое, што ім даюць на ўроках гісторыі.

У школах дзяцей трэба абавязкова прыцягваць да стварэння музейных экспазіцый. Ёсць добрыя клубы з патрыятычным ухілам. Не менш важныя экскурсіі для школьнікаў і студэнтаў па маршрутах і месцах баявой славы. Асобнай увагі заслугоўваюць пытанні валанцёрскага руху, уключэння ў такія праекты моладзі. Бо для ветэранаў мае значэнне не столькі матэрыяльная дапамога, колькі ўвага, якую ім удзяляюць, магчымасць падзяліцца ўспамінамі. У гэтым і ёсць пераемнасць.

Усе гэтыя кірунку ў комплексе працуюць на павышэнне эфектыўнасці сістэмы патрыятычнага выхавання. Моладзь павінна ведаць гісторыю сваёй краіны, сваёй сям'і, разумець, часткай чаго яна з'яўляецца.

На хвалі

# НОВЫЯ ІМЁНЫ «МАЛАДЫХ ТАЛЕНТАЎ БЕЛАРУСІ»

**У афіцыйным Telegram-акаўнце Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё абнародаваны вынікі IX Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі».**




Як вядома, сёлетні конкурс праводзіўся пад знакам юбілейнай даты — 75-годдзя Вялікай Перамогі, і па ўмовах творчага спаборніцтва фіналісты намінацыі «Эстрадны вакал» выконвалі беларускія творы, прысвечаныя Перамозе. Усяго на адрас арганізатараў конкурса паступіла каля 400 заявак, а ў фінал прайшлі 157 канкурсантаў (124 сольныя выканаўцы і 33 калектывы). Фінальны тур «Маладых талентаў Беларусі» праводзілі ў відэафармаце.

Уладальнікамі Гран-пры конурсу сталі Настасся Жабко (намінацыя «Эстрадны вакал»), Аляксей Іардасопаль («Інструментальная музыка») і Улада Філіповіч («Спадчына»). Першыя месцы ў намінацыі «Эстрадны вакал. Салісты» ў трох узроставых катэгорыях занялі Марыям Абдэлькадэр, Алена Цітова і Лада Шчарбіцкая. Вакальнае трыа DivVoice стала першым у намінацыі «Эстрадны вакал. Ансамблі». Што датычыцца намінацыі «Інструментальная музыка. Сола», то тут першыя месцы ў трох узроставых катэгорыях узялі Дзмітрый Янучок (фартэпіяна), Ксенія Сяліцкая (саксафон) і Ілья Кокін (домра). А ўладальнікам дыплома першай ступені ў намінацыі «Інструментальная музыка. Ансамблі» стаў дуэт «Натхненне». У фальклорнай намінацыі «Спадчына. Сола» перамогу атрымалі Мілана Заікіна, Аліса Доўнар і Ганна Шэмет, а лаўрэатам першай ступені ў намінацыі «Спадчына. Ансамблі» стаў ансамбль народнай музыкі «Верас».

З поўным спісам прызёраў і ўладальнікаў спецыяльных дыпломаў конкурсу можна азнаёміцца на сайце Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё **radio1.by.** Віншуем пераможцаў!

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 113

Не лікам, а ўменнем. Для вырашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела, дзе белыя атрымліваюць перамогу над сіламі саперніка, якія моцна пераўзыходзяць.

№ 41



№ 41

**Белыя простыя шашкі:** g3, b4, c5, c7 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, e3, e5, g5, a7, e7, g7, d8 (8)

№ 42

**Белыя простыя шашкі:** b2, e3, d4, c5 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** c3, a5, h6, a7, c7, e7, g7 (7)

№ 43

**Белыя простыя шашкі:** h2, c3, e3, b4 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** g3, f4, g5, b6, d6, f6, e7, g7 (8)

№ 44

**Белыя простыя шашкі:** e1, d2, f2, e3, b6, c7 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, d4, f4, h4, c5, e5, g5, a7, e7, d8 (10)

№ 45

**Белыя простыя шашкі:** e1, f2, g3, b6, c7 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** b4, d4, c5, e5, g5, a7, e7, d8 (8)

№ 46

**Белыя простыя шашкі:** e1, d2, f2, e3, h4 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, b4, d4, c5, g5, f6, h6, c7, e7 (9)

У шашках-100 прапануецца праблема Генадзя Андрэева (Латвія)

№ 47

**Белыя простыя шашкі:** 49, 42, 38, 39, 31, 33, 34, 35, 26, 29, 22, 18 (12)

**Чорныя простыя шашкі:** 41, 27, 28, 21, 24, 25, 17, 20, 11, 13, 7, 9, 10 (13)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваны.

**Праверце свае рашэнні:**

Выпуск № 112 ад 24.04.20.

№ 35 1. e5-d6 c5:e7 2. g3-h2 b8:g3 3. h2:a3 h6:f4 4. a3:b4 a5:c3 5. c1-b2 c3-d2 6. e1:c3+

№ 36 1. f6-e7 a7:c5 2. e7-d8 c5:e7 3. d8:a3 g3-f2 4. a3-c5+ (Як паведаміў трымальнік картатэкі шашачных кампазіцый Анатоль Панчанка, гэтая пазіцыя ўжо была апублікаваная Рымасам Мацкявічусам на форуме «Планетка» 3 лютага 2017 года).

№ 37 1. 33-28 23:43 2. 39:48 26:37 3. 48-42 37:48 4. 40-35 48:30 5. 35:02 25-30 6. 02:35+

№ 38 1. 25-20 15:35 2. 39:30 35:24 3. 28-22 17:28 4. 32:03 21:41 5. 03:36 26:37 6. 36-47+

№ 39 1. d6-e7 f8:f4 [1...b8:f4 2. h6:b4 f8:d6 3. b4:h6 h4-g3 4. h6-e3 g3-h2 5. e3-g1]

2. h6:b4 b8:d6 3. b4:h6 h4-g3 4. h6-e3 g3-h2 5. e3-g1+ ППР 1. cd8 указаў А. Панчанка.

№ 40 1. e5-d6 c5:g5 2. h6:f4 h8:f6 3. f4-g5 f6:h4 4. h2-g3 h4:f2 5. g1:c5 c7-d6 6. c5:e7+

З лістоў чытачоў: «Дзякую вядучаму-аўтару за творчасць! Хачу таксама падтрымаць іншых чытачоў і выказаць сваю думку ў адносінах да вашых твораў, бо яны рашаюцца з задавальненнем і прыносяць нам, аматарам гэтай гульні, радасць і жаданне займацца гэтай справай і у далейшым!» — піша Леанід Жыхар. «Дзякую аўтару-вядучаму за кампазіцыі! Рашаць іх было адно задавальненне!» — выказванне з ліста Фёдара Карпея.

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013.*

*e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



Каб помнілі

# ФІЛЬМЫ, ЯКІЯ НЕЛЬГА ГЛЯДЗЕЦЬ СПАКОЙНА

**Кожны фільм, дзе ў складзе каманды ёсць імя Руслана Туркова ў якасці сцэнарыста, рэжысёра альбо аўтара, можна смела раіць гледачам, якія шукаюць праўдзівага, дасавернага і новага падыходу да любой тэмы. Калі гаварыць пра Вялікую Айчынную вайну, то многія, думаю, згадаюць такія праекты, як «Сімвал Перамогі», «За секунду да подзвігу», «Беларусь памятае», фільмы «Яны забівалі анёлаў», «Незабыты подзвіг» і многія іншыя, што ствараліся і ствараюцца камандай АТН Белтэлерадыёкампаніі. Напярэдадні 75-га Дня Перамогі мы распыталі ў Руслана, наколькі складана сёння гаварыць на тэму вайны.**

## ПРАЎДА І АСАБІСТЫ ВЫБАР

— Праекты, у якіх закранаецца і раскрываецца тэма Вялікай Айчыннай вайны, — гэта праца нашай вялікай каманды. Кожны раз хочацца знайсці нейкую навізну і ў фармаце, і ў тым, што мы робім, сказаць тое, чаго яшчэ не гаварылі да нас. І, безумоўна, важная задача — нейкім чынам паўплываць на моладзь, звярнуць яе ўвагу на гісторыю нашай краіны, нагадаць, як кавалі Перамогу іх дзяды і прадзеды... За часы здымак такіх праектаў мне ўдалося шмат дзе пабываць. Памятаю, калі здымалі «Сімвал Перамогі», я размаўляў з ветэранам у Валгаградзе і спытаў у яго: што самае страшнае на вайне? І ён адказаў, што гэта авія- ці мінамётны налёт, калі ты не ведаеш, адкуль прыляціць снарад.



Мы імкнёмся па магчымасці дазнавацца ўсё ад відавочцаў... Над кожным праектам, фільмам працуем так, каб зацікавіць тэмай гледачоў розных пакаленняў. Аўдыторыя вельмі патрабавальная, што трымае нас, тэлевізійнікаў, у тонусе. Падрыхтоўка да здымак заўсёды патрабуе часу, а самі здымкі, нават роліка ў некалькі хвілін, займаюць не адзін дзень. Потым ужо толькі чакаеш, калі скончыцца мантаж і можна будзе ўбачыць вынікі працы. Я патрабавальны да дэталяў і да прафесіяналізму кожнага. Напрыклад, калі мы здымаем выбух, то мне хочацца быць упэўненым, што акцёру не трапіць камень у галаву. Як паказвае вопыт, наша здымачная група на многае гатова дзеля кадра — і танк у студыю прывезці, і патрэбны торф знайсці ці нават акопы капаць. Калі здымалі ролік пра Зінаіду Корж і нам патрэбна была зямлянка, то яе будавалі ўсе разам.

## АДКАЗНАСЦЬ І АКЦЭНТЫ

— Перш чым нешта сказаць на тэму вайны, варта пераправерыць інфармацыю дзесяць разоў. Бо з часам у людзей згладжваюцца ўспаміны, нешта падзабываецца, штосьці абагульняецца, а твая задача — данесці гледачу дакладную інфармацыю. У канцэнтрацыйных лагерах у Германіі заўважаў, як, напрыклад, робіцца акцэнт: маўляў, «вось у вайну тут быў канцэнтрацыйны лагер, а пасля адразу лагер НКУС» (пры гэтым не кажуць, што там сядзелі і тыя, хто мучыў вязняў падчас вайны). Ці Асвенцым — толькі некалькі радкоў вы сустрэнеце пра тое, што яго вызвалялі савецкія салдаты, затое абавязкова даведаецеся, як тут знішчалі яўрэяў. Але ж там былі і беларусы, і рускія, і ўкраінцы, і іншыя народы. Паспрабуйце там знайсці могілкі савецкіх салдат, якія загінулі падчас вызвалення, — яны схаваныя так, што туды мала хто дойдзе... Таму трэба пра гэта гаварыць, нагадваць і рабіць усё, каб такія падзеі не паўтарыліся.

Нашчадкі тых, хто здабыў для нас Перамогу, па-рознаму раскрываюцца ў працэсе здымак. Калі мы працавалі над адным з ролікаў «Беларусь памятае» (гісторыя пра Мікалая Абедняка), то так супала, што здымалі на лініі Сталіна якраз у дзень нараджэння нашага героя, калі ён здзейсніў подзвіг. І для



яго ўнука Мікіты ўдзел у здымачным працэсе стаў магчымасцю «пражыць» атмасферу таго часу і гісторыю свайго дзеда. Бо сёння, калі жывём у бяспецы і ў камфорце, складана ўявіць, у якіх умовах тады змагаліся, але хоць надзеўшы тую форму і страляючы, седзячы ў акопах, ты можаш быццам перанесціся ў часе... Ведаеце, назіраючы за тым, што цяпер адбываецца ў свеце, я думаю пра тое, што сёння, як і ў тыя часы, людзей зноў аб'ядноўвае агульная бяда. У Беларусі вайна закранула амаль кожную сям'ю, таму праект «Беларусь памятае» атрымаў такі шырокі водгук ад гледачоў. Нам дасылаюць лісты, напісаныя ад рукі, і просяць расказаць і пра іх родных. На жаль, мы не можам расказаць пра кожнага.

## ШТО ПАГЛЯДЗЕЦЬ 9 МАЯ?

— У гэты дзень у нас у эфіры будзе шмат ваенных праектаў. Напрыклад, Алена Борматава рыхтуе свой праект пра Брэсцкую крэпасць, хоць, здавалася б, столькі ўжо расказана. Ён будзе называцца «Брэст. Героі фарпоста». А Марыя Мураўёва робіць ролікі «Ветэраны аб Перамозе»: ветэраны з розных краін будуць віншаваць нашых пераможцаў. Усе гэтыя праекты мы робім з вялікай павагай і ўдзячнасцю да кожнага ветэрана. Віншуем іх са святам і жадаем моцнага здароўя. Не такое праходзілі і тут выстаім!

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з архіва Белтэлерадыёкампаніі.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** Зона Х. Крымінальная хроніка (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Навіны надвор'я.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Фальшывая нота» (12+).**
**13.05, 15.25 Серыял «Скачок Багамола». 1—2-я серыі (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.00** «Зона Х». Крымінальныя навіны (12+).
**21.00** Панарама.
**21.50** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**23.45** Арэна.
**0.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.40** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00** «Зразумець. Дараваць» (16+).
**10.05** Камень, нажніцы, папера (16+).
**10.40** «Да пабачэння» (16+).
**11.25 Серыял «Тры дні лейтэнанта Краўцова». 1—4-я серыі (16+).**
**14.55 Серыял «Прывітанне ад Кацюшы». 1—4-я серыі (12+).**
**19.15** Суперлато.
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.15 Драма «Дарога на Берлін» (16+).**
**22.50** Ідзі сюды і танцуй.
**22.55** «Вячэра не патрэбна» (16+).
**23.50 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Хвораст.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30** «Вызваленне». Фільмы першы і другі (12+) [СЦ].
**11.35** «Фарбы памяці». Мастак Лазар Ран.
**12.25** Фільм-канцэрт «Памяць жыве...».
**13.05** «Вызваленне». Фільмы трэці—пяты, заключны (12+) [СЦ].
**17.45** «Легенды кіно». Аляксей Баталаў (12+).
**18.25 «Ляцяць жураўлі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**20.00** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Беларускі вакзал». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**22.45** «Перамога». Канцэрт Валерыя Галаўко.

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10, 10.35, 12.30** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі.
**9.05** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**9.50** Вынікі тыдня.
**14.30** Піт-стоп.
**15.00, 22.40** Дзюдо. Чэмпіянат свету.
**16.55** Вось гэта спорт!
**17.05** Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга.
**19.20** Спорт-цэнтр.
**19.30** Хакей. Чэмпіянат свету. Літва — Беларусь.
**21.30** На грані фолу. Футбольны агляд.
**22.30** Спорт-цэнтр.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00, 8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Контуры».
**10.10** «Жыць здорава!» (16+)
**11.10,13.10 Серыял «Анёлахоўнік» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 «Каця і Блэк». Серыял (16+).**
**22.10 Серыял «Садовае кольца» (16+).**
**0.10** Булат Акуджава. «Надзеі маленькі аркестрык...» (12+)

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**9.45, 23.50** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «У жніўні 44-га». Драма (12+).**



**12.40, 21.20** «Самыя шакуючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.00** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.45, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.45, 16.50 «Ускрыццё пакажа». Серыял (16+).**
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**0.30** «Мінтранс» (16+).
**1.15** «Самая карысная праграма» (16+).

## МІР

**6.00** М/ф (6+).
**6.15, 10.10 Серыял «Сямнаццаць імгненняў вясны» (12+).**
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.00, 16.15, 19.15 Серыял «Паляванне на гауляйтара» (12+).**
**0.40 Серыял «Лінія Марты». 1—4-я серыі (12+).**
**4.10 Маст. фільм «Волга-Волга» (12+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.25** «Па сакрэце ўсяму свету» (12+).
**13.00** «У людзях».
**13.35** «Плюс-мінус».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Драма «Добраахвотнікі» (12+).**
**17.15** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Бацькоўскае права» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Спорт-мікс.
**6.30** «Алтар Перамогі» (0+).
**7.20, 8.30 Драма «Кіроўца для Веры» (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25** «Чакай мяне» (12+).
**11.15 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).**
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.50** За гранню (16+).
**14.10 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы» (16+).**
**16.25, 19.40, 22.25, 23.45** Сёння. Галоўнае.
**17.00** «ДНК» (16+).
**18.00 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**19.55** «Экспэртыза злачынстваў» (16+).
**20.25 Серыял «Рыкашэт» (16+).**
**22.30** «НЗ.by».
**22.50 Серыял «Шэлест. Вялікі перадзел» (16+).**
**0.00 Дэтэктыў «Яшчэ не вечар» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.50, 18.15, 21.10** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.00** «Мультпарад». «Рапунцэль: новая гісторыя» (6+).
**7.50, 15.55, 18.10, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.55 Камедыя «Я крочу па Маскве» (16+).**
**9.20, 20.00 Серыял «Бачыць» (16+).**
**10.20** Дак. перадача. Наступствы віруса для людзей (0+).
**11.30 Баявік «Трайны фарсаж: Такійскі дрыфт» (12+).**
**13.20 Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава» (6+).**
**14.50 Серыял «Безразважна закаханыя» (12+).**
**16.45 Камедыя «Уверх нагамі» (16+).**
**18.20 Серыял «Белая рабыня» (18+).**
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.15 Драма «Прагулка ў аблоках» (16+).**
**23.10 Трылер «Берлінскі сіндром» (18+).**
**1.10** «Надвор'е» + «Аэравідэа».

## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.20** «Лаві момант» (16+).
**8.35** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**9.10** М/ф «Пацяшоба» (0+).
**9.30** М/ф «Царэўны» (6+).
**9.55** М/ф «Тры каты» (0+).
**10.30, 2.25** «Проста кухня» (16+).
**11.00** «Дзеткі-продкі» (12+).
**12.00** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.45, 3.00** «Рогаў дома» (16+).
**13.45** «Уральскія пельмені». Пляжны шызон (16+).
**15.00** «Дзякуй богу, ты прыйшоў!» (16+)
**16.00** Трылер «Венам» (16+).
**17.50** Анімацыйны фільм «Узмахні крылом (0+).
**19.35** «Уральскія пельмені». Ратуйце нашы вушы (16+).
**21.00** Камедыя «Бармен» (16+).
**22.45** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**23.45** «Нерэальная гісторыя» (16+).
**1.05** «Уральскія пельмені» (16+).
**4.40** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Фока — на ўсе рукі дока» «Зачараваны хлопчык». М/ф.
**7.40** «Паездка ў Індыю». Маст. фільм.
**10.20** «Звычайны канцэрт».
**10.50** «Гэтыя неверагодныя музыканты, або Новыя сны Шурыка». Фільм-канцэрт.
**11.55** Да юбілею Святланы Святлічнай. «Калекцыя Пятра Шапацініка».
**12.20** «Лісты з правінцыі». Парфеньеўскі раён (Кастрамская вобласць) [СЦ].
**12.50** Дыялогі пра жывёл. Заапаркі Чэхіі [СЦ].
**13.35** «Іншыя Раманавы». «Дзікае сэрца Мары, ці Тысячы кветак для мамы» [СЦ].
**14.05** «Зорка жыцця і смерці». Дак. фільм [СЦ].
**14.50** Спектакль Маскоўскага Губернскага тэатра «Сірано дэ Бержэрак».
**18.05** «Шукальнікі». «Талісман Месінга» [СЦ].
**18.55** «Рамантыка раманса».
**19.55** «Дзённы цягнік». Маст. фільм [СЦ].
**21.30** «Адна ноч у Луўры». Дак. фільм.
**22.35** «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Хуан Дыега Флорэс і Вольга Перацяцька ў спектаклі опернага тэатра Монтэ-Карла «Казкі Гофмана». 2018 год.
**1.15** «Мой пяшчотна любімы дэтэктыў». Маст. фільм [СЦ].
**2.40** «Старая кружэлка». М/ф. для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1961-ы (12+).
**7.00, 9.45, 11.00, 14.35, 15.45, 17.00, 21.45, 23.35, 3.45, 5.00** Музычная Настальгія (12+).
**7.15** Маст. фільм «Усміхніся суседу» (12+).
**8.15** «Пра цябе і пра мяне». Песні Ю. Антонава. 1987 год (12+).
**9.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**12.00** Маст. фільм «Гарачыя дзянькі» (12+).
**13.30** «Вакол смеху». 1978 год (12+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** «Пад знакам задыяка» (16+).
**17.05** «Мантаж». 1988 год (16+).
**18.00** Тэлеспектакль «Дарога на Чатанугу» (16+).
**20.00** Фільм-канцэрт гурта «Дзеці». 1988 год (12+).
**21.00** Худ. фільм «Каханне з прывілеямі» (16+).
**00.00** Спектакль Маскоўскага тэатра «Сучаснік» «Вечна жывыя» (16+).
**2.25** «Ранішняя пошта». 1986 год (12+).
**4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).

## EuroSport 1

**0.00** Аўтагонкі. Формула Е — 2017 (12+).
**1.00** Аўтагонкі. WTCC-2017 (12+).
**2.30** Снукер. German Masters — 2020 (6+).
**6.00** Матагонкі. «24 гадзіны Ле-Мана» — 2019 (12+).
**9.00** Ралі-рэйд. Дакар-2019 (12+).
**9.30, 20.00** Тэніс. Player's Cut (6+).
**12.30** Снукер. The Players Championship (6+).
**15.00** Веласпорт. «Джыра-д'Італія» — 2019 (12+).
**23.00** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы». Рыа-2016 (12+).

## Кінакамедыя

**1.05** Я — мільярдэр (16+).
**2.50** Маска Зора (12+).
**5.00** Легенда Зора (6+).
**7.20** Басанож па горадзе (18+).
**9.00** Каханне жыве тры гады (16+).
**11.00** Каралеўства поўнага месяца (16+).
**12.45** Крывёю і потам: анаболікі (16+).
**15.15** Гэты няспраўны момант (16+).
**17.20** Ілюзія падману (16+).
**19.30** Ілюзія падману-2 (12+).
**21.50** Хлапечнік у Еўропе (18+).
**23.50** Захачу і саскочу (16+).

## ТБ3

**6.00** М/фы (6+).
**8.30** «Улегцы» (12+).
**9.00** Калекцыя Беларусьфільма: «Ба-бу» (12+).
**10.30** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**11.20** Серыял «Жыць далей» (16+).
**15.05** Анімацыйны фільм «Тры волата і Шамаханская царыца» (12+).
**16.30** Серыял «Я ніколі не плачу» (12+).
**20.15** «ТБЗ вядзе расследаванне» (16+).
**21.15** «Асцярожна ашуканцы!» (16+)
**21.50** «Троя». Драма (16+).
**0.40** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**2.05** «Жыць далей». Драма (16+).
**5.20** «Без падману» (16+).

## ТБ1000

**6.10** Разня (16+).
**7.45** Што хавае хлусня (16+).
**9.20** Іншыя (16+).
**11.10** Прыгоды Падынгтана (6+).
**12.45** Прыгоды Падынгтана-2 (6+).
**14.35** Турыст (16+).
**16.20** Солт (16+).
**18.00** Містар і місіс Сміт (16+).
**20.10** Шальныя грошы (16+).
**22.00** Візантыя (16+).
**00.05** Па-за правілаў (18+).
**2.20** Дарыян Грэй (16+).
**4.10** Жарты ўбок-2: Місія ў Маямі (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**7.15** Падземелле ведзьмаў (12+).
**9.00** Сэлфі (16+).
**11.00** Dyxless (16+).
**12.50** Ярды (16+).
**14.25** 9-я рота (16+).



**16.50** 72 метры (12+).
**19.00** Канікулы прэзідэнта (16+).
**20.40, 5.45** Пра любоў (16+).
**22.35** Месца, якое прайгралі (16+).
**0.20** Пасажырка (16+).
**2.05** Халоднае танга (18+).
**3.50** Кіроўца для Веры (16+).

## National Geographic

**6.00** Шырокі погляд з Кэлам Пэнам (16+).
**6.15** Гульні розуму (16+).
**7.50** Варожая планета (16+).
**8.40, 1.50** Асушыць акіян (16+).
**11.05, 3.30** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**13.30** Аўта-SOS (16+).
**15.00** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**16.40** Паранармальнае (16+).
**18.15** Таемная гісторыя (16+).
**19.00, 22.45, 1.05** Космас: магчымыя сусветы (16+).
**19.45** Гісторыя дзесяцігоддзяў (16+).
**0.20** Таямніцы светабудовы (16+).

## Discovery

**8.00** Махінатары (12+).
**8.45, 16.40** Як гэта зроблена? (16+)
**9.10** Пажарная брыгада (12+).
**10.00** Смяротны ўлоў (16+).
**11.40, 21.15** Дальнабойшчык у В'етнаме (12+).
**12.30, 5.00** Вялікае і Рычард Хаманд (12+).
**13.20, 5.45** Стадыён (12+).
**14.10, 23.05** Роб Рыгл даследуе свет (12+).
**15.00, 7.15** Вялікі свет гульняў (12+).
**15.50** Як гэта ўстроена? (12+)
**17.35** Сакрэты падземелля (12+).
**19.25** Узрываючы гісторыю (12+).
**20.20** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**22.10** Невядомая экспедыцыя (16+).
**0.00, 6.30** Пагранічная служба: Іспанія (16+).
**0.55** Самагоншчыкі (18+).
**1.50** Паляўнічы на цацкі (12+).
**4.15** Каралі аўкцыёнаў (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліюецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.35, 16.10 Меладрама «Пра што не раскажа рака» (16+).**
**8.15** Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.50** Гісторыі выратавання (12+).
**10.30** Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
**11.10** Вакол планеты.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Меладрама «Вядзьмарскае возера». 1-я і 2-я серыі (16+).**
**14.20** «Шлях музыканта». Дак. фільм (12+).
**15.15** Твой горад.
**15.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**19.45** «На вылет!» (12+)
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.10 Меладрама «Я ніколі не плачу». 1—4-я серыі (16+).**

## Беларусь 2

**6.55 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**8.40** М/с «Цімон і Пумба» (0+).
**9.20, 19.25** Тэлебарометр.
**9.25** «Подыум» (16+).
**10.15** «Да пабачэння» (16+).
**11.00** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**11.50** «Свет навыварат. Бразілія» (16+).
**13.00 Баявік «Каўбоі супраць прышэльцаў» (12+).**
**15.00** «Тата папаў» (16+).
**16.30** «Вежа» (12+).
**17.25 Баявік «Жалезны чалавек» (12+).**
**19.55** «Сакрэтны мільянер» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.20 Трылер «Кловерфілд, 10» (16+).**
**23.00** «Супержонка» (16+).
**0.00** «Трэці лішні» (16+) [СЦ].

## Беларусь 3

**7.35** «Святыні Беларусі».
**8.00, 14.30, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 14.50, 20.35** «Гэты дзень».
**8.25** «Мішка-задзіра». Мультфільм (0+).
**8.35 «Ты — мне, я — табе». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня». Наліснікі з грыбамі.
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.45 «...А досвіткі тут ціхія». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**14.55** «Славянскі базар у Віцебску — 2019».
**16.35 «Корцік». Маст. фільм (6+) [СЦ].**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Жыве такі хлопец». Маст. фільм (12+).**
**22.45** Акцыя «Майстры культуры — ветэранам». «І памятае свет выратаваны». Святочны канцэрт да 75-годдзя Перамогі.
*[СЦ] — фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10, 9.35** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі.
**9.05** Трэніровачны дзень.
**11.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**12.00, 22.30** Барацьба. Чэмпіянат свету.
**13.50** Піт-стоп.
**14.20** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Прэв'ю.
**14.50** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Белшына» (Бабруйск) — ФК «Віцебск».
**16.50** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Іслач» (Мінскі р-н).
**18.50** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Рух» (Брэст) — ФК «Смалявічы».
**21.00** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**21.45** Вынікі тыдня.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** [СЦ] Нашы навіны.
**7.10** «Здароўе» (16+).
**8.05** «Жыццё іншых» (12+).
**9.10** «Нядзельная пропаведзь» [СЦ].
**9.25** «Метэагід».
Уявіце сабе, што ўсяго ў нацысцкай Германіі і на тэрыторыі акупаваных ёю краін была наладжана дзейнасць больш чым 14 тысяч канцлагераў, гета і турмаў. Паводле афіцыйнай статыстыкі, за гады Другой сусветнай вайны праз лагеры смерці прайшло больш за 20 мільёнаў чалавек з 30 краін свету. З іх 5 мільёнаў — грамадзяне Савецкага Саюза. Прыблізна 12 мільёнаў вязняў, у тым ліку 2 мільёны дзяцей, было забіта. Невыпадкова ў 1946 годзе Нюрнбергскі міжнародны трыбунал кваліфікаваў практыку фашысцкіх канцлагераў як злачынства супраць чалавецтва.

А цяпер пяройдзем ад глабальнай да мясцовай статыстыкі, якая таксама моцна ўражвае. **Старшыня Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў Андрэй ПАЎКШТА** кажа, што ўсяго ў раёне 104 помнікі, абеліскі, магілы і месцы пахаванняў ахвяр фашызму. Сярод іх — 54 воінскія пахаванні. А 4 брацкія магілы маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

— Усе яны дагледжаныя. За іх станам уважліва сочаць сельсаветы, нашы дэпутаты, яны ладзяць памятныя мерапрыемствы, асабліва вясной; сюды прыводзяць школьнікаў, тут ускладаюць кветкі, успамінаюць загінулых. У падтрыманні парадку вакол помнікаў фінансава ўдзельнічае ўсё больш прадпрымальнікаў, — кажа старшыня райсавета.

Сёння напярэдадні святкавання Вялікай Перамогі хочацца ад імя рэдакцыі «МС» падзякаваць усім мясцовым Саветам і іх дэпутатам, намаганнямі якіх захоўваюцца ваенныя помнікі — гэтыя вузельчыкі народнай памяці пра мінулае ліхалецце.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# ФАРМАТ АДКРЫТАГА ДЫЯЛОГУ

## Прамую тэлефонную лінію і анлайн-канферэнцыю правёў сенатар у сваёй акрузе

**У сённяшней эпідэміялагічнай сітуацыі сенатары працягваюць работу са зваротамі грамадзян ва ўсіх даступных фарматах. Кожны раз форма стасункаў будзе выбірацца ў залежнасці ад абставін. Фармат анлайн-канферэнцыі ў прамым эфіры з жыхарамі Камянецкага раёна з трансляцыяй на YouTube-канал выбраў член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр КАРПІЦКІ.**

### ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ, ГАНДАЛЬ

На мінулым тыдні сенатар цэлы дзень працаваў у сваёй акрузе. Спачатку прайшла прамая тэлефонная лінія для жыхароў Камянецкага раёна Брэстчыны. Шэраг зваротаў, як і мінулы раз, датычыўся добраўпарадкавання асобных вуліц і двароў раённага цэнтра. Напрыклад, жыхары дома нумар 68 па вуліцы Брэсцкай паскардзіліся на арганізацыю, якая праводзіла добраўпарадкаванне пасля здачы ў эксплуатацыю дома. На месцы газона з травой пасля нават невялікага дажджу ўтвараецца вялізная лужына — што ўжо казаць пра лівень! Дзеці сядзяць на беразе «возера» і кідаюць каменьчыкі. У спёку ж, наадварот, узнікаюць пясчаныя буры. Словам, добраўпарадкаванне не давялі да канца. Гэты зварот пераадрасавалі ЖКГ. Праблема, як і некаторыя іншыя ўзнятыя пытанні, пастаўлена на кантроль.

Некалькі званкоў датычылася работы сельскіх магазінаў. Людзі па-ранейшаму аддаюць перавагу стацыянарным гандлёвым пунктам, хоць абслугоўванне аўталаўкамі арганізавана на належным узроўні. А вось тэлефонны абанент з вёскі Дзмітровічы палічыў недастатковым асартымент свайго прамтаварнага магазіна. Па сваёй звычайнай завядзёнцы Аляксандр Карпіцкі нагадаў адрасы асноўных зваротаў. У названай краме аказаліся ў наяўнасці ўсе асноўныя рэчы, якія патрэбны ў побыце. Прадавец паведаміла, што буйнагабарытныя тавары звычайна прывозяцца пад заказ, такая практыка існуе даўно.

Варта сказаць, што некалькі званкоў выражалі падзякі за нялёгкую працу медыкаў у цяперашні складаны перыяд. Апроч таго, асобныя абаненты дзякавалі за станоўчае вырашэнне пытанняў, агучаных падчас мінулых прыёмаў і прамых ліній.

### ПРА РАБОТУ БАЛЬНІЦЫ

Анлайн-канферэнцыя з членам Савета Рэспублікі адбылася пры садзейнічанні раённай газеты «Навіны Камянеччыны» ў яе рэдакцыі. Абсалютная большасць пытанняў, якія задавалі жыхары раёна, датычылася цяперашняй сітуацыі з захваральнасцю на каранавірус. Сенатар, галоўны ўрач Брэсцкай абласной бальніцы, адказаў кожнаму, хто пытаў.

Найперш, вядома, спыталі, якая зараз сітуацыя з каранавірусам у Брэсцкай вобласці: колькі чалавек хварэе, колькі паправілася?

— На сённяшні дзень (29 красавіка. — **Аўт.**) на каранавірусную інфекцыю хварэе 681 чалавек, — паведаміў Аляксандр Карпіцкі. — Прыкладна палова з іх праходзіць лячэнне ў стацыянарах, астатнія — амбулаторна. 142 чалавекі выпісаны з бальніцы. Амаль у 80 працэнтах выпадкаў захворванне працякае ў лёгкай форме. 20—25 працэнтаў — пацыенты, якім патрабуецца стацыянарнае лячэнне. Прыкладна ў пяці працэнтаў цяжкая форма.

***— Ці праходзяць лячэнне ў інфекцыйным аддзяленні абласной бальніцы пацыенты з COVID-19 з нашага раёна? Калі так, які іх стан?***

— Тры чалавекі з Камянецкага раёна лечацца ў абласной бальніцы. Іх стан — ад здавальняючага да цяжкага, але мы спадзяёмся, што ўсе яны паправяцца. Яшчэ чатырох жыхароў раёна выпісалі на амбулаторнае лячэнне, яны практычна здаровыя.

***— Якія першыя ўрокі пандэміі, на што ў далейшым трэба будзе звярнуць увагу ў арганізацыі работы абласной бальніцы?***

— Варта адзначыць, што мы рыхтаваліся сустрэць гэтую інфекцыю. Па-першае, загадзя, не падазраючы, што да нас прыйдзе пандэмія, узялі ўдзел у праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча—Беларусь—Украіна». Разам з калегамі з Бяла-Падляскі рэалізуем мерапрыемствы па паляпшэнні эпідэміялагічнай сітуацыі на польска-беларускім памежжы. У рамках праграмы ўдалося аснасціць абласную бальніцу абсталяваннем, якое дапамагае ў тым ліку кантраляваць стан хворых на каранавірус. Мы набылі шматразовыя касцюмы, якія абараняюць ад біялагічнай інфекцыі, транспартную камеру для пацыентаў, заражаных асабліва небяспечнай інфекцыяй, апошнюю выкарыстоўваем цяпер. З польскімі медыкамі правялі шэраг трэнінгаў і вучэбных заняткаў. Я нават сказаў бы, што мы на крок апярэджваем інфекцыю. І, вядома, не варта забываць, што Беларусь не першая краіна, якая сутыкнулася з COVID-19. Мы назіраем і выкарыстоўваем вопыт калег з іншых краін у барацьбе з гэтай навалай.


Аляксандр КАРПІЦКІ падчас анлайн-канферэнцыі.

***— У Віцебску можна здаць тэст на каранавірус як хворым, так і людзям без яўных сімптомаў. Тэст робяць бясплатна. Ці з'явіцца такая магчымасць у Брэсце хоць бы на платнай аснове?***

— У нашым абласным цэнтры працуюць дзве лабараторыі, якія займаюцца дыягностыкай каранавіруснай інфекцыі: адна ў цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, другая — у скурна-венералагічным дыспансеры. Абедзве яны моцна загружаныя, працуюць у тры змены, і грамадзянам па іх жаданні не робяць тэсты ні платна, ні бясплатна. Аналізы бяруцца па паказаннях. Тая колькасць тэстаў, якая праводзіцца сёння, цалкам дастатковая для выяўлення пацыентаў, што патрабуюць лячэння. Таму пытанне аб арганізацыі лабараторыі, якая рабіла б тэсты для ўсіх ахвотных, пакуль не паўстае.

***— Сёння медыкам у першую чаргу патрабуецца максімальная абарона ад інфекцыі. А якія меры перасцярогі прымае сам сенатар?***

— Як і ўсе ў гэтай сітуацыі. Па-першае, я лічу, што панікаваць не варта. Чалавек заўсёды павінен думаць, што ўсё будзе добра, і гэта датычыцца любога захворвання. Арганізм дакладна рэагуе як на пазітыў, так і на негатыў, якія праграмуе мозг. Цяпер жа я рэкамендую ўсім насіць маскі, па максімуме адмовіцца ад наведванняў грамадскіх месцаў, не групавацца. Трэба думаць не толькі пра ўласную абарону, але і пра тое, што кожны можа стаць крыніцай віруса для навакольных. Вось такіх правіл і прытрымліваюся.

### ЭПІДЭМІЯЛАГІЧНАЯ НАСЦЯРОЖАНАСЦЬ ЗАХОЎВАЕЦЦА

***— А дзе вы правялі вялікія выхадныя?***

— Фактычна на рабоце. У нас не было выхадных. У суботу прымалі міністра аховы здароўя Уладзіміра Караніка. Ён прыязджаў для маніторынгу і ацэнкі гатоўнасці Брэстчыны на выпадак масавага паступлення хворых з інфекцыяй. Паводле ацэнкі міністэрства, пакуль у нас сітуацыя спрыяльная. Спадзяёмся, што тэндэнцыя захаваецца, але гатовыя да любога развіцця падзей.

***— Акрамя індывідуальнай абароны, якія меры прафілактыкі вы лічыце дзейснымі? Ці варта прыслухоўвацца да парад народнай медыцыны?***

— Ажыятажны попыт на лімон, імбір, часнок, на жаль, нічым не абумоўлены. Вядома, названыя прадукты карысныя, як і ўсе іншыя, што ўтрымліваюць вітаміны, мікраэлементы. Трэба есці таксама буракі і моркву. Варта памятаць, што свежыя агародніна і фрукты актывізуюць абарончыя сілы арганізма, але ад каранавіруса, на жаль, не абароняць.

***— Ці можна гаварыць пра ўсплёск хваробы пасля праваслаўных святаў?***

— Гэта будзе вядома, калі паявіцца статыстычныя звесткі. Магу сказаць, што святары з каранавірусам пасля свят у бальніцу паступалі. Гэта канстатую як факт.

***— Як сёння працуе абласная бальніца?***

— У рэжыме інфекцыйнага шпіталя мы пачалі працаваць з 28 лютага. У той дзень да нас паступілі першыя пацыенты, якія былі кантактамі першага ўзроўню. Хворых яшчэ не было. З той пары зроблена многае. Праведзена поўная рэструктурызацыя ложкавага фонду. Выдзелена пяць аддзяленняў для лячэння хворых з каранавіруснай інфекцыяй. Планавая дапамога значна скарочана. У поўным аб'ёме аказваецца экстранная дапамога і дапамога пры неадкладных праблемах, калі ёсць пагроза жыццю пацыента. Сітуацыя эпідэміялагічнай насцярожанасці захоўваецца ва ўсіх аддзяленнях. Бессімптомныя носьбіты інфекцыі, якія паступаюць з усіх рэгіёнаў вобласці, могуць павялічыць колькасць інфіцыраваных супрацоўнікаў. Такія выпадкі ёсць і ў іншых краінах, і ў Беларусі. Мы стараемся прымаць усе меры па абароне нашага персаналу.

***— Калі ў найбліжэйшы час не будзе вынайдзена вакцына, ці абавязкова мы ўсе перахварэем?***

— Не ўсе, але многія. Для набыцця папуляцыйнага імунітэту ў розных формах павінна перахварэць ад 60 да 80 працэнтаў насельніцтва. На шчасце, большасць беларусаў хварэе альбо ў лёгкай форме, альбо ў сцёртай, альбо ў форме носьбіцтва.

Як расказаў карэспандэнту «МС» Аляксандр Карпіцкі па выніках анлайн-канферэнцыі, ён задаволены такой формай стасункаў са сваімі выбаршчыкамі. Кожны чалавек мог задаць пытанне і адразу атрымаць адказ. Асабліва парадавалі тыя ўдзельнікі дыялогу, што праз галоўнага ўрача выказалі падзяку і падтрымку ўсім супрацоўнікам абласной бальніцы, якія сёння на пярэднім краі барацьбы з каварнай інфекцыяй.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

---

ПАТРЭБНАЯ ДАПАМОГА

# «Маскі добрай якасці. Дзякуй за клопат і ўвагу»

**Сенатар Валянцін БАЙКО не застаўся ўбаку ад добрых спраў і перадаў сродкі індывідуальнай абароны ва ўстановы аховы здароўя Гродна, Мастоў, Ваўкавыска і Шчучына.**

Не так даўно член Савета Рэспублікі ад Гродзенскай вобласці, адзін з заснавальнікаў сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Контэ Спа» Валянцін Байко перадаў урачам некалькі тысяч медыцынскіх масак, на выраб якіх цяпер пераарыентавана частка вытворчасці. Маскі трохслойныя: два слаі — з мікрафібры, адзін — фільтруючы элемент з бавоўны.

Сёння сродкі індывідуальнай засцярогі як ніколі запатрабаваныя, бо расход іх дастаткова вялікі: усе медыцынскія работнікі, што працуюць пры аказанні рэанімацыйнай дапамогі, інтэнсіўнай тэрапіі, робяць гэта ў адмысловай экіпіроўцы. Выраблены на прадпрыемстве маскі, безумоўна, станучь добрым унёскам у справу захавання здароўя пацыентаў і медработнікаў.

Так, Шчучынскай ЦРБ передадзена 2400 санітарна-гігіенічных масак, Мастоўскай і Ваўкавыскай ЦРБ — па 2000, Ваўкавыскаму раённаму дому-інтэрнату для састарэлых і інвалідаў — 800. Установы абраныя невыпадкова: менавіта гэтыя рэгіёны сенатар прадстаўляе ў верхняй палаце парламента.

Дарэчы, дапамога таксама аказана Гродзенскаму абласному клінічнаму перынатальнаму цэнтру.

— Дапамагчы сродкамі індывідуальнай абароны тым, хто цяпер знаходзіцца на перадавой барацьбы з каварным вірусам, — гэта самае малое, што мы можам зрабіць для нашых медыкаў. Яны — сапраўдныя байцы, якія без лішняй мітусні і панікі робяць сваю справу, лечаць людзей. І ў нашых магчымасцях падтрымаць іх у гэты няпросты перыяд, каб разам перадолець пандэмію каранавіруса і вярнуцца да звыклага ладу жыцця, — адзначыў Валянцін Байко.

— Мы ўдзячныя сенатару за аказаную дапамогу, бо сродкі абароны, асабліва ў цяперашняй сітуацыі, з'яўляюцца найбольш запатрабаванымі ў медустановах, — падкрэсліў **галоўны ўрач Мастоўскай ЦРБ Аляксандр КОЗІЧ.** — Маскі добрай якасці. Дзякуй за клопат і ўвагу. Паверце, такі ўздзел у жыцці і здароўі нашых медыцынскіх работнікаў і пацыентаў шмат каштуе.

**Па матэрыялах раённых газет «Дзянніца», «Зара над Нёманам», «Наш час».**

# Ігар ГЕДЗІЧ: «Каб нечага дасягнуць, трэба імкнуцца нешта зрабіць»

**Аб статусе сенатара і дэпутата базавага ўзроўню, рабоце з людзьмі і... «Палёце над гняздом зязюлі»**

**Усе гэтыя тэмы карэспандэнт «МС» абмеркаваў з членам Савета Рэспублікі, дырэктарам Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра Ігарам ГЕДЗІЧАМ. Невыпадкова яны аказаліся ў цэнтры ўвагі падчас нашай сустрэчы: сенатар, які быў абраны падчас нядаўніх парламенцкіх выбараў, прадстаўляе інтарэсы жыхароў Воранаўскага, Іўеўскага і Ашмянскага раёнаў Гродзеншчыны і адначасова з'яўляецца дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў 28-га склікання. Пагадзіцеся, ужо назапашаны няхай і невялікі, але вопыт дзейнасці ў якасці народнага абранніка, таму гутарку мы вырашылі распачаць якраз з высвятлення розніцы паміж гэтымі пасадамі. Дарэчы, ніводная з іх не прадугледжвае, як кажуць, адрыву ад асноўнай работы суразмоўніка — служэння Мельпамене.**



— У чым розніца статусаў? — на імгненне задумваецца ён. — Хіба што зварот у якасці члена Савета Рэспублікі (калі параўноўваць з дэпутатам гарсавета) прадугледжвае больш уважлівае стаўленне выканаўчых органаў да пытанняў, якія ўзнімаюцца. Гэта не значыць, што ўсе перад табой рассцілаюцца, спяшаюцца пабегчы і выканаць, але адчуваецца, што адносяцца больш уважліва і адказна.

Канешне, усё залежыць ад прафесіяналізму каманды на месцах, і тут можа спрацаваць банальны чалавечы фактар. Але гэта хутчэй выключэнне, чым практыка, кажа суразмоўнік, — звычайна дэманструюць апаратыўнасць і зладжанасць.

Ці неабходна складаць паўнамоцтвы дэпутата базавага ўзроўню пасля абрання ў якасці члена Савета Рэспублікі? Як высветлілася, зусім не.

— Адно другому не перашкаджае, проста даводзіцца сумяшчаць гэтую дзейнасць, — растлумачыў Ігар Гедзіч. З яго пункту гледжання пашыраецца геаграфія зваротаў і павялічваецца колькасць тых, хто патрабуе ўважлівага вывучэння свайго пытання.

З чым даводзіцца працаваць? Тэматыка большай часткі зваротаў бадай што не залежыць ад месца пражывання заяўніка — перыферыя гэта ці абласны цэнтр — і датычыцца работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі і зямельных праваадносін. Іншая справа, што статус сенатара прыцягвае больш людзей на прыём, бо, як яны лічаць (і гэта справядліва), іншы ўзровень паўнамоцтваў можа паспрыяць больш сур'ёзнаму разгляду тэмы, якая іх хвалюе.

Але ёсць і тыя, хто карыстаецца гэтай магчымасцю ў спадзяванні абысці літару закона, — маўляў, вы ж заканатворца, дапамажыце павярнуць пытанне на маю карысць.

— Зразумела жаданне чалавека вырашыць усё па-свойму, — разважае суразмоўнік. — І не так важна для яго, што гэта парушэнне закону, усё роўна стаіць на сваім: дапамажыце вырашыць, і ўсё! Тлумачыш, што ёсць заканадаўчае поле і мы дзейнічаем у яго межах.

> У нас ёсць спектакль «Палёт над гняздом зязюлі», лейтматыў якога наступны: «Ты хоць паспрабуй нешта зрабіць». І тут трэба спрабаваць. Заўсёды.

У сувязі з гэтым Ігар Гедзіч згадаў зварот былога вайскоўца, які настойваў на павялічэнні пенсіі. Як высветлілася, мужчына пасля звальнення з войска некалькі гадоў нідзе не працаваў, таму пры налічэнні пенсіі па ўзросце яму не хапіла страхавога стажу. Здаецца, сам вінаваты, але заяўнік так не лічыць.

— Па гэтай тэме былі зроблены адпаведныя запыты міністру абароны і міністру працы і сацыяльнай абароны, каб падрыхтаваць абгрунтаваны адказ, а не адпіску, — тлумачыць сенатар. — Безумоўна, у выніку быў падрыхтаваны (можа, і не надта прыемны) адказ, сутнасць якога ў наступным: вам перш за ўсё трэба працаваць.

Не магла не пацікавіцца, ці ёсць розніца ў характары зваротаў на ўзроўні абласнога цэнтра і глыбінкі.

— Магчыма, у рэгіёнах жывуць больш простыя людзі, тэмп жыцця ў іх крыху іншы, запаволены, таму, імаверна, у рэгіёнах узнікаюць больш простыя пытанні, а ў горадзе — больш складаныя, якія патрабуюць комплекснага вырашэння, — выказвае меркаванне Ігар Гедзіч.

І ў якасці прыкладу згадвае заяўніцу з аддаленага раёна Гродзеншчыны, якая прыйшла на прыём, каб высветліць лёс сваяка ў Кітаі. Для гэтага было дастаткова патэлефанаваць у пасольства.

— Трэба было толькі знайсці выхады: паглядзець, пачытаць і знайсці адказ на сваё пытанне. Але ў некаторых людзей няма такой магчымасці альбо жадання, таму яны ідуць да прадстаўнікоў улады: выкажучай, заканадаўчай, прадстаўнічай — гэта зразумела, — тлумачыць суразмоўнік.

Згадваючы гэты выпадак, сенатар называе яго прыкладам аператыўнага вырашэння праблемы на ўзроўні «пытанне — адказ». Але 99 % пытанняў не такія павярхоўныя і адназначныя. Амаль кожнае патрабуе дадатковага вывучэння і дасканалага разбору.

Між тым, як паказвае вопыт, дапамогу трэба шукаць не толькі наверсе:

— Кожны чыноўнік, сенатар, дэпутат, з майго пункту гледжання, без выключэння добрасумленна выконвае свае абавязкі, і калі, напрыклад, патэлефанаваць дэпутату базавага ўзроўню, ён заўсёды дапаможа, ён абавязаны гэта зрабіць, — упэўнены Ігар Гедзіч. — У нас ёсць спектакль «Палёт над гняздом зязюлі», лейтматыў якога наступны: «Ты хоць паспрабуй нешта зрабіць». І тут трэба спрабаваць. Заўсёды.

На пытанне, як атрымліваецца сумяшчаць столькі абавязкаў, суразмоўнік здзіўляе адказам:

— Я пакуль працую без памочнікаў, таму што хачу пагледзець, якія людзі патрэбныя побач, хто рэальна можа дапамагчы ў рабоце, канкрэтным заяўнікам, якія будуць звяртацца з пытаннямі да члена Савета Рэспублікі. Хочацца разабрацца, таму пакуль адзін. Як у ваенных: ёсць задача, трэба ацаніць абставіны і толькі потым прыняць рашэнне. Так і тут.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

### Коммунальное производственное дочернее унитарное предприятие «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ»

| Лот | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Дебиторская задолженность – ОАО «Диброво-2013» (УНП 690657733) | 2280,69 | 22,81 | 114,03 |
| 2 | Дебиторская задолженность – ОАО «ПМК-187» (УНП 600042422) | 2101,53 | 21,02 | 105,08 |
| 3 | Дебиторская задолженность – ДУП «ПМК-182» УП «Минскоблсельстрой» (УНП 690018954) | 2746,35 | 27,46 | 137,32 |
| 4 | Дебиторская задолженность – ОАО «ПМК 88», Вилейский район (УНП 600010728) | 3820,36 | 38,20 | 191,02 |
| 5 | Дебиторская задолженность – ДУП «ПМК-196» УП «Минскоблсельстрой» (УНП 690019088) | 7632,60 | 76,33 | 381,63 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые повторные торги. Окончание приема заявлений в 18.00 22.05.2020

Публикация об аукционе ранее размещалась в газете «Звязда» № 63 от 01.04.2020 С. 4

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник, явился для участия в аукционе и он согласен приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе предмета аукциона производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 25.05.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержится на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi

Документы, необходимые для участия в аукционе – заявление на участие в аукционе; платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих полномочия участника аукциона (его представителя).

Задаток перечисляется на следующие реквизиты: ГП «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ», УНП 690608054, р/с BY40BPSB30121256890749330000 в ЦБУ № 504 в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 143Б, БИК BPSBBY2X. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ГП «Молодечностройматериалы» (Лот № __), проводимом __.__.2020 г.

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметами аукциона. Контактное лицо: Алексеева Анастасия Андреевна 8 (029) 392 89 06.

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Коммунальное производственное дочернее унитарное предприятие «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» в лице антикризисного управляющего ООО «ПрофДМ» ☎ 8 (017) 395-81-34, 8 (017) 395-89-17, 8 (029) 392-89-06, 222306, г. Молодечно, Минская обл., ул. Сухая, д. 73, ком. 301** |
| **Организатор торгов** | **ООО «ПрофДМ», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1-1127, 8 (017) 395-81-34, 8 (017) 395-89-17, 8 (029) 392-89-06** |

## Извещение о проведении 19 мая 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| Предмет торгов |
|---|
| капитальное строение с инв. номером 611/С-498, общей площадью 47,3 кв. м, наименование – трансформаторная подстанция; трансформатор, инв. № 572.1, 1979 года ввода в эксплуатацию; электрощитовая высокого напряжения, инв. № 572.2, 1979 года ввода в эксплуатацию; электрощитовая низкого напряжения, инв. № 572.3, 1979 года ввода в эксплуатацию |
| Местонахождение: Минская обл., Березинский р-н, Поплавский сельский совет |
| Сведения о земельном участке: площадь – 0,0056 га, кадастровый номер – 620484300001000007 |
| Начальная цена: 1 401,55 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 140,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **19 мая 2020 года** в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 08.05.2020 по 15.05.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»).

Настоящим уведомляем, что торги, назначенные на 15.05.2020 г. в 12.00, по продаже имущества ОАО «МонолитГрад», на открытом аукционе, объявление о которых было опубликовано в газете «Звязда» № 81 стр. 11 от 25.04.2020 г., **отменены.**

ДОБРАЯ СПРАВА

# НІХТО НЕ АДЧУЕ СЯБЕ ПАКІНУТЫМ!



У Гомельскім, Веткаўскім і Добрушскім раёнах шмат зроблена і робіцца цяпер для падтрымкі састарэлых у перыяд распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі. Да гэтай дзейнасці далучыліся ўсе галіны ўлады, установы аховы здароўя, сацыяльныя службы, арганізацыі, аб'екты гандлю, праваахоўныя органы і грамадскія арганізацыі.

Член Савета Рэспублікі Таццяна Абель сумесна са старшынямі раённых Саветаў дэпутатаў Гомельскага, Добрушскага і Веткаўскага раёнаў Вікторыяй Ладуцька, Уладзімірам Емяльянавым і Віктарам Масейкавым штодзённа маніторыць сітуацыю і аналізуе, дзе патрэбна дапамога ў першую чаргу.

Так, пярвічная арганізацыя ГА «Беларускі саюз жанчын» пры Бальшавіцкім сельвыканкаме Гомельскага раёна падтрымала марафон, арганізаваны грамадскім аб'яднаннем «Беларускі саюз жанчын». Актывісткі сваімі рукамі пашылі сродкі індывідуальнай засцярогі — марлевыя павязкі шматразовага выкарыстання. Больш за 150 вырабленых масак было перададзена работнікам бальніцы сястрынскага догляду ў пасёлку Бальшавік. Частку з іх сшылі на базе касцюмернага цэха заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь цырка імя Валерыя Абеля.

— Мы падрыхтавалі павязкі для медыцынскіх работнікаў, — адзначыла Таццяна Абель, — каб людзі адчувалі сябе ў большай бяспецы. Гэта дапамога і супрацоўнікам, і пацыентам, якія знаходзяцца тут, адчуваць сябе больш абароненымі ад інфекцый.

Між тым у Веткаўскім раёне праводзіцца шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на прафілактыку захворвання на рэспіраторныя інфекцыі сярод насельніцтва. На асаблівым кантролі — дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў «Шубіна». У гэтай установе штодня праводзіцца кантроль стану здароўя супрацоўнікаў. Задача — не дапусціць людзей з сімптомамі рэспіраторных захворванняў да работы.

У Добрушы лекі і прадукты харчавання адзінокім пажылым людзям гатовыя даставіць праваахоўнікі і сацработнікі. Супрацоўнікі міліцыі прайшлі інструктаж і пры штодзённай адпрацоўцы адміністрацыйных участкаў абавязкова наведваюць адзінокіх састарэлых, цікавяцца іх здароўем, даведваюцца пра пажаданні. Папрасіць аб дапамозе пажылыя людзі могуць і наўпрост па тэлефонах участковых інспектараў або па адзіным нумары 102. З мэтай прадухілення распаўсюджвання інфекцыі, выкліканай каранавірусам COVID-19, адзінокія пажылыя грамадзяне, інваліды I і II групы штодня могуць звярнуцца па дапамогу, па дастаўку прадуктаў харчавання, медыкаментаў, тавараў першай неабходнасці ў службу сацыяльнай падтрымкі Добруша.

Між тым усе цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Гомельскай вобласці працягваюць працаваць у пашыраным рэжыме: падоўжаны час работы, працуюць дадатковыя тэлефоны гарачых ліній. На дапамогу сацслужбам прыйшлі грамадскія арганізацыі. Дастаўку ўсяго неабходнага пажылым людзям ажыццяўляюць валанцёры Чырвонага Крыжа, БРСМ, прафсаюзных і царкоўных арганізацый. Не засталіся ўбаку і работнікі паштовых аддзяленняў.

У межах акцыі «Добрае сэрца» адміністрацыя, супрацоўнікі і навучэнцы Гомельскага дзяржаўнага аўтамеханічнага каледжа набылі і даставілі бутлі з пітной вадой у Гомельскую гарадскую клінічную бальніцу № 1.

Валанцёры пярвічнай арганізацыі БРСМ каледжа пад кіраўніцтвам майстра вытворчага навучання Ірыны Сіманчук арганізавалі распаўсюджванне інфармацыі пра метады і сродкі прафілактыкі вірусных інфекцый. Актывісты размяшчалі ўлёткі на дошках аб'яў на прыпынках грамадскага транспарту і каля ўваходаў у пад'езды жылых дамоў. Пазначаны там таксама тэлефоны гарачай лініі, на якія адзінокія пенсіянеры могуць звярнуцца па дапамогу ў дастаўцы лекаў і прадуктаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота дадзена Гомельскай абласной арганізацыяй Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.**

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**ЗАО «Центр промышленной оценки» сообщает о проведении 10.06.2020 электронных торгов с 9.00 до 16.00 по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Свитязь»**

| Количество лотов | Наименование имущества | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Задаток | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|
| 8 | Извещение о проведении электронных торгов и подробные сведения о реализуемых лотах (недвижимость, оборудование, дебиторская задолженность, иное имущество) размещены на сайте **www.bankrot.gov.by** (в разделе «должники», «ОАО «Свитязь», «реализация») и электронной торговой площадке **ipmtorgi.by** | Указана на сайте www.bankrot.gov.by | 10 % | 5 % |

Срок подачи заявок на участие в торгах: **08.06.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).**

Месторасположение имущества: Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Белинского, 54А. Ознакомление с предметом торгов: в рабочие дни с 09.00 до 16.00, тел. +375 (29) 696-70-06.

**Список реализуемого имущества и подробная информация о порядке проведения аукциона размещены на сайтах www.bankrot.gov.by и ipmtorgi.by.**

УНП 400241807

ОБЪЯВЛЕНИЕ

**Открытое акционерное общество «Мехколонна № 93»**

(далее – ОАО «Мехколонна № 93»),
**расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 13, сообщает о том, что наблюдательным советом ОАО «Мехколонна № 93» принято решение о проведении**
**10 июня 2020 года в 11.00**
**внеочередного общего собрания акционеров (протокол № 4 от 05.05.2020 года) согласно п. 30 Устава ОАО «Мехколонна № 93».**
Место проведения собрания:
220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 13, кабинет 303.
Форма проведения – очная.

**Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Мехколонна № 93»:**

1 О ликвидации Общества.
2. О назначении ликвидатора Общества.
3. Об определении порядка и сроков ликвидации Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 13 (каб. 214), в период с 11 мая 2020 г. по 09 июня 2020 г. по рабочим дням с 10.00 до 16.00, либо 10 июня 2020 года по месту проведения собрания.

**Регистрация акционеров внеочередного общего собрания будет проводиться 10 июня 2020 г. с 10.00 до 10.50 по месту проведения общего собрания.**

**Начало работы собрания – 10 июня 2020 года в 11.00.**

**Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 03 июня 2020 года.**

Для регистрации при себе необходимо иметь следующие документы: акционеру ОАО «Мехколонна № 93» (физическому лицу) – паспорт, руководителю юридического лица, являющегося акционером – документ, подтверждающий его должностное положение и паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100003019 ***Наблюдательный совет***

**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.

Продавец: **ООО «Оптимальный Свет Плюс»** (УНП 101193046) в лице управляющего по делу о банкротстве индивидуального предпринимателя Макаренко Татьяны Петровны, тел. +375 (29) 619-36-59.

Первые повторные электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 797-17Б/2015 в экономический суд г. Минска будут проведены **26 мая 2020 г. 9.00–16.00** на электронной площадке BELTORGI.BY.

Предмет торгов – Лот № 11523. **Изолированное помещение (квартира), расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 95 А, кв. 7, 5-й этаж, общей площадью по СНБ 174,8 кв.м,** общая площадь жилого помещения 160,9 кв. м, площадь жилых комнат – 101,00 кв. м, кадастровый № ЕГРНИ 500/D-70793783, есть обременения. Начальная цена предмета торгов – 739 543,84 бел. руб. без НДС, минимальная цена предмета торгов – 665 589,46 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 08.05.2020 г. 09.00 по 25.05.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток в размере 36 977,19 бел. руб. на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. В ходе торгов начальная цена лота ежечасно начиная со второго часа проведения торгов при отсутствии ставок на повышение начальной цены снижается равными долями до минимальной цены лота. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов (подробнее на beltorgi.by). Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 15 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 19.03.2020 г.

**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.
Продавец: ОАО «Трест Белтрансстрой» (УНП 100120922), 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 8,
Тел. +375172251985, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридическое антикризисное агентство «ВИТКОНСАЛТ».
Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **25 мая 2020 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Токарно-винторезный станок СНА 500/1000, зав. № 86А1Р017, инв. № 20035 | 2 916,00 |
| 2 | Токарно-винторезный станок 16К-20, зав. № 02629, инв. № 20023 | 2 808,00 |
| 3 | Токарно-винторезный станок 1В62ГФ320, зав. № 226, инв. № 25335 | 2 592,00 |
| 4 | Токарно-винторезный станок 1В62Г, зав. № 1234, инв. № 20073 | 2 592,00 |
| 5 | Широкоуниверсальный фрезерный станок 675, зав. № 2850, инв. № 20077 | 1 728,00 |
| 6 | Вертикально-фрезерный станок, зав. № н/у, инв. № 20075 | 1 728,00 |
| 7 | Поперечно-строгальный станок 7Б-35, зав. № 32116, инв. № 20063 | 831,60 |
| 8 | Кругло-шлифовальный станок ЗУ 131, зав. № 7584, инв. № 20089 | 3 348,00 |
| 9 | Кран башенный КБ-402 Б, зав. № 4557, инв. № 7 | 19 872,00 |
| 10 | Кран башенный КБ-402 А, зав. № 941, инв. 7 | 14 160,00 |

**Местонахождение – г. Минск, ул. Казинца, 11, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 08.05.2020 г. 09.00 по 22.05.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано на сайте bankrot.gov.by.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 7 мая 2020 года.